WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

13 ЖНІЎНЯ 2011 г.
СУБОТА
№ 153
(27017)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Работнікам будаўнічага комплексу Рэспублікі Беларусь

ПАВАЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БУДАЎНІЧАГА КОМПЛЕКСУ!

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём будаўніка

Людзі гэтай стваральнай прафесіі знаходзяцца на пярэднім краі пераўтварэнняў і карыстаюцца асаблівай павагай і аўтарытэтам у грамадстве.

Шматтысячны атрад беларускіх будаўнікоў рэалізуе маштабныя праекты ва ўсіх рэгіёнах краіны: будуе жыллё і сацыяльна значныя аб'екты, пракладвае дарогі і лініі метрапалітэна, узводзіць прамысловыя прадпрыемствы і масты, вяртае да жыцця архітэктурныя шэдэўры і гістарычныя помнікі, робіць больш прыгожым воблік гарадоў і вёсак.

Добрая слава пра старанных і ўмелых працаўнікоў пацвярджаецца і на аб'ектах, што ўзводзяцца беларусамі за мяжой, што ў сваю чаргу дазваляе пашыраць экспартныя магчымасці нашай краіны.

Сярод прыярытэтных задач галіны — павышэнне аб'ёмаў і якасці будаўнічай прадукцыі. Каб забяспечыць іх выкананне на сучасным узроўні, разгорнута маштабная мадэрнізацыя прадпрыемстваў, якія выпускаюць будаўнічыя матэрыялы, і рэканструкцыя домабудаўнічых камбінатаў.

Росту якасці і эфектыўнасці работ у будаўнічай галіне садзейнічаюць пераход на еўрапейскія нормы праектавання і будаўніцтва, энергазберажэнне і павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва энергаэфектыўнага жылля, асваенне замежных рынкаў і будаўнічых пляцовак, а таксама рэалізацыя іншых накірункаў, якія адпавядаюць патрабаванням часу.

Упэўнены, што нарошчванне патэнцыялу будаўнічага комплексу, высокі прафесіяналізм і майстэрства яго цудоўных працаўнікоў дазволяць і надалей дабівацца поспехаў у ажыццяўленні напружаных планаў на карысць беларускага народа.

Жадаю вам невычэрпнай энергіі, моцнага здароўя, выдатнага настрою, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЛІДАРЫ КРАІН АДКБ ДАМОВІЛІСЯ АБ УЗМАЦНЕННІ РОЛІ АРГАНІЗАЦЫІ ЎЖО СЁЛЕТА

Нефармальны саміт лідараў краін — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы прайшоў у Астане.

Фота БЕЛТА.

Для ўдзелу ў пасяджэнні сабраліся кіраўнікі шасці дзяржаў: Беларусі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана. Цікава, што Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, нібыта забыўшыся аб нефармальнасці цяперашняй сустрэчы і з'явіўшыся ў гальштуку, зняў яго пад дзясяткам аб'ектываў тэлекамер перад уваходам у залу пасяджэння.

Адкрываючы пасяджэнне, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка як старшыня арганізацыі ў гэтым годзе адзначыў, што на парадку дня разгляд глабальных рэгіянальных пагроз бяспецы і стабільнасці дзяржаў — членаў АДКБ. «У шэрагу краін гэтага рэгіёну разгортваюцца разбуральныя працэсы, якія патрабуюць пільнай увагі, а магчыма, і адпаведнага рэагавання ў інтарэсах забеспячэння бяспекі і стабільнасці нашых дзяржаў».

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў саміту знаходзіліся пытанні павышэння эфектыўнасці дзейнасці арганізацыі, а таксама вырашэння праблем, якія ўзнікаюць у адносінах паміж дзяржавамі — членамі АДКБ. Адным з пытанняў, вынесеных на абмеркаванне, стаў маючы адбыцца вывад амерыканскіх войскаў з Афганістана, а таксама пытанні прыродна-тэхнагенных катастроф у зоне адказнасці АДКБ. Удзельнікі пасяджэння адзначаюць значны рост пагроз міжнароднага тэрарызму, незаконнага гандлю зброяй, наркотыкамі і маюць намер звярнуць увагу на вялікі блок пытанняў у сферы інфармацыйнай бяспекі.

На праведзенай сустрэчы кіраўнікі дзяржаў — членаў АДКБ прызналі, што ў арганізацыі ёсць шэраг недахопаў унутранага характару, прычым гэта не толькі праблемы, якія сёння існуюць у краінах АДКБ, але і паміж дзяржавамі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. «Мы крытычна падышлі да той работы, якая праводзілася АДКБ, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэтыя праблемы ў нас ёсць, і мы адназначна заявілі, што ўжо ў гэтым годзе зробім шэраг захадаў, якія павысяць ролю Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, і мы значна рушым наперад».

Кіраўнікі дзяржаў АДКБ поўныя рашучасці завяршыць працэс камплектавання і ўзбраення Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання.

«У нас з'явілася шмат напрамкаў дзейнасці ў сувязі з апошнімі падзеямі ў свеце, у тым ліку з тымі, што адбываюцца па лініі арабскай дугі, афрыканскай поўначы. Мы дамовіліся, што будзем выпрацоўваць сумесныя намаганні меры процідзеяння магчымым пагрозам, перш за ўсё ў інфармацыйнай і кіберпрасторы», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Акрамя таго, на гэтай сустрэчы кіраўнікі краін АДКБ прааналізавалі тыя нарматыўна-прававыя дакументы, якія былі нядаўна падпісаны, і дамовіліся да сустрэчы ў афіцыйным фармаце ў снежні гэтага года іх ратыфікаваць. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь ужо завяршыла іх ратыфікацыю. «У нас сёння няма ніводнага дакумента, які мы не ратыфікавалі б», — сказаў ён. Падводзячы вынікі праведзенага нефармальнага саміту, Аляксандр Лукашэнка зноў звярнуў увагу на тое, што лейтматывам гэтага мерапрыемства стала ўзмацненне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. «Мы павінны зрабіць, і мы гэта зробім — узмоцнім АДКБ, і ў бліжэйшы час зробім вельмі важныя захады, якія будуць сведчыць аб умацаванні нашай арганізацыі».

Як дадаў генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа, лідары краін АДКБ вялікую ўвагу ўдзялілі таксама пытанням павышэння салідарнасці і ўзаемнай падтрымцы дзейнасці арганізацыі, асабліва на знешнепалітычнай дузе. Паводле яго слоў, гэтаму пытанню, як асноўнаму, з пункту гледжання ўзаемнай падтрымкі дзяржаў надаецца вельмі вялікае значэнне.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Фідэля Кастра Руса з 85-годдзем

«Ваша актыўная шматгадовая праца, накіраваная на ўстойлівае развіццё незалежнай Рэспублікі Куба, не толькі атрымала заслужаны аўтарытэт і павагу суайчыннікаў, але таксама пасадзейнічала развіццю і ўмацаванню шматбаковых плённых адносінаў Кубы з шэрагам дзяржаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў: «Мы вельмі цэнім цёплыя, сяброўскія адносіны, якія ўсталяваліся паміж беларускім і кубінскім народамі. Упэўнены, што Беларусь і Куба будуць працягваць развіваць двухбаковае стратэгічнае партнёрства, заснаванае на прынцыпах узаемадапамогі і павагі агульных інтарэсаў нашых краін».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Фідэлю Кастра моцнага здароўя, бадзёрасці духу, поспехаў ва ўсіх пачынаннях, а ўсяму дружалюбнаму кубінскаму народу — міру, дабрабыту і працвітання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зацверджана Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Беларусі на 2011—2015 гады

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 11 жніўня падпісаў указ № 357 «Аб зацвярджэнні Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Грошы

НАЦБАНК ПАВЯЛІЧВАЕ СТАЎКУ РЭФІНАНСАВАННЯ ДА 22 ПРАЦЭНТАЎ ГАДАВЫХ

З 17 жніўня 2011 года стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка павялічваецца на 2 працэнтныя пункты — з 20 да 22 працэнтаў гадавых, паведамляе прэс-служба Нацбанка.

Паслядоўнае павелічэнне стаўкі рэфінансавання праводзіцца на працягу ўсяго 2011 года. Яно накіравана на павышэнне кошту заёмных грошай у эканоміцы як важнай умовы паэтапнага ўзмацнення жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі Нацбанка. Разам з іншымі эканамічнымі захадамі ўрада гэта будзе спрыяць стабілізацыі сітуацыі ў знешнегандлёвай сферы і абмежаванню інфляцыйных працэсаў. Між іншым, павелічэнне намінальнага ўзроўню працэнтных ставак у якасці элемента стабілізацыйнай палітыкі з'яўляецца сусветнай практыкай.

Па меры развіцця пазітыўных тэндэнцый у эканоміцы і на фінансавым рынку Нацбанк вернецца да паступовага зніжэння стаўкі рэфінансавання.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МАСКВА І КІЕЎ НЕ ДАМОВІЛІСЯ ПРА ЦАНУ НА ГАЗ

Перыяд збліжэння і стабільнасці ў адносінах Расіі і Украіны, распачаты з прыходам да ўлады ў Кіеве Віктара Януковіча, завяршыўся, піша «РБК daily».

Прымаючы ў Сочы свайго ўкраінскага калегу, Дзмітрый Мядзведзеў папярэдзіў яго, што пытанне газавага супрацоўніцтва Расіі і Украіны «з'яўляецца няпростым і патрабуе абмеркавання». Аднак, як адзначае выданне, мяркуючы па ўчорашніх перамовах, знайсці рашэнне не атрымалася. Эксперты лічаць, што змяншаць кошт цяпер зусім не ў інтарэсах Расіі, а вось новая газавая вайна вельмі не пашкодзіла б Газпраму.

Выданне нагадвае, што Кіеў дамагаецца перагляду формулы, зацверджанай у 2009 годзе экс-прэм'ерам Юліяй Цімашэнкай. Саму Цімашэнку судзяць за так званую газавую справу. У сваю чаргу, эксперты выдання сцвярджаюць, што дамаўляцца ў цяперашніх умовах не ў інтарэсах Газпрама. «Расійскі бок больш зацікаўлены ў новым газавым канфлікце з Украінай. Газавая вайна патрэбна для апраўдання будаўніцтва «Паўднёвай плыні» і шматмільярдных газаправодаў, якія злучаюць Ямал з Чорным морам, каб маглі падзарабіць падрадчыкі, кампаніі, што спецыялізуюцца на пракладцы газаправодаў», — заявіў выданню эксперт, дадаўшы, што ў гэтым няма ніякага эканамічнага сэнсу. Для Расіі нашмат зручнейшым было б транспартаваць больш газу па адной трубе, чым увесь яго аб'ём падзяліць паміж двума газаправодамі — «Паўночнай плынню» і «Паўднёвай».

ПАЗЫКОВЫ КРЫЗІС У ЕЎРОПЕ: ПАРТУГАЛІІ ДАЮЦЬ 111 МЛРД ДОЛАРАЎ, ДОЎГ ІТАЛІІ ПЕРАВЫСІЎ 1,9 ТРЛН ЕЎРА

Прадстаўнікі Еўрасаюза, Міжнароднага валютнага фонду і Еўрапейскага цэнтральнага банка папярэдне далі «зялёнае святло» на выдаткаванне Партугаліі 111,06 млрд долараў у рамках праграмы па фінансавай падтрымцы гэтай пірэнэйскай краіны. Пры гэтым, паводле слоў міністра фінансаў Партугаліі Вітора Гаспара, у пытанні ўсё яшчэ застаюцца сур'ёзныя праблемы, піша The Wall Street Journal.

Дзяржаўны доўг Італіі ў чэрвені 2011 года дасягнуў рэкордная для краіны адзнакі ў 1,9 трлн еўра, паведамляе цэнтрабанк краіны. Для пераадолення пазыковага крызісу ўрад Сільвіа Берлусконі мае намер дамагчыся ў найбліжэйшыя тры гады скарачэння бюджэтнага дэфіцыту на 47,9 млрд еўра, што прадугледжвае скарачэнне дзяржаўных выдаткаў.

У БАЛГАРЫЮ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У Балгарыі з 4 жніўня ўступілі ў сілу змяненні ў закон пра замежных грамадзян на балгарскай тэрыторыі, а таксама пастанова пра ўмовы і парадак выдачы віз.

Гэтымі нарматыўнымі дакументамі ўводзяцца новыя патрабаванні ў адпаведнасці з Візавым кодэксам ЕС. Адначасова ўводзіцца новы ўзор заявы на атрыманне візы.

Патрабаванні да пашпарта: сапраўдны пашпарт, выдадзены не раней, чым 10 гадоў таму; тэрмін дзеяння пашпарта павінен быць не менш трох месяцаў з дня меркаванай даты выезду з тэрыторыі Рэспублікі Балгарыя; змяшчаць не менш за дзве вольныя старонкі для віз.

Тэрмін разгляду заявы на атрыманне візы «Аэрапортны транзіт» і на кароткатэрміновую ўязную візу (тып «С») — да 15 каляндарных дзён з дня падачы заявы. На выдачу візы на працяглае знаходжанне (тып «Д») заявы разглядаюцца Службай адміністрацыйнага кантролю Балгарыі — да 35 працоўных дзён з дня падачы.

БРЫТАНЦЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА ВЫСЯЛЕННЕ ПАГРОМШЧЫКАЎ

Брытанцы прагаласавалі за пазбаўленне ўдзельнікаў беспарадкаў усіх дапамог і высяленне іх з сацыяльнага жылля, паведамляюць інфармагенцтвы.

Адпаведную анлайн-петыцыю да раніцы 12 жніўня падпісала больш за 116 тыс. чалавек, у той час як па законах Вялікабрытаніі для разгляду падобных мер у парламенце дастаткова 100 тыс. галасоў.

Аўтары дакумента перакананы, што брытанскія падаткаплацельшчыкі не павінны аказваць сацыяльную падтрымку тым, хто ўдзельнічаў у пагромах і рабаваннях, а таксама праявіў непавагу да законаў дзяржавы. Петыцыю падтрымаў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран падчас выступлення ў парламенце 11 жніўня. Прэм'ер таксама прапанаваў пашырыць паўнамоцтвы суддзяў для вынясення прысудаў, якія прадугледжваюць турэмнае зняволенне.

Прагнозы

ПАЦЯПЛЕННЕ КЛІМАТУ «З'ЕСЦЬ» ЕЛКУ, ЯСЕНЬ І ЧОРНУЮ АЛЕШЫНУ

А на свабодных тэрыторыях будуць вырошчваць дубы і лістоўніцу

Ад неспрыяльных кліматычных фактараў, якія выкліканы ў тым ліку і глабальным пацяпленнем, на тэрыторыі Беларусі штогод гіне прыкладна ад 5 да 23 тысяч гектараў лясоў, паведаміў учора ў прэс-цэнтры Дома прэсы выканаўца абавязкаў дырэктара ДНУ «Інстытут эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі» Аляксандр ПУГАЧЭЎСКІ.

Спецыялісты падлічылі, што, у адпаведнасці з мадэллю агульнай цыркуляцыі атмасферы, да 2050 года ў Беларусі можна чакаць павышэння тэмператур зімы на 2,3—3,8 градуса і лета на 1,1—1,8 градуса. Такое хуткае пацяпленне пачне інтэнсіўна змяняць расліннасць на нашай тэрыторыі. Следам за цеплынёй значна паменшыцца вільготнасць глебы, што сур'ёзна ўдарыць па відавой разнастайнасці нашых лясоў.

Навукоўцы падлічылі, што такое змяненне клімату ажно на 20 працэнтаў «загубіць» елку ў паўднёвых і цэнтральных рэгіёнах Беларусі ўжо да 2050 года.

Ад засухі і жукоў-караедаў пакутуюць не толькі яловыя лясы, але і ўсе высокаўзроставыя дрэвы, а таксама чорная алешына і ясень. Сапраўды, дарослыя дрэвы сфарміравалі свой жыццёвы цыкл у іншых кліматычных умовах, і цяпер ужо цяжка адаптуюцца да актыўнага і працяглага пацяплення.

Чорная алешына і ясень цяжка пераносяць падсохлыя глебы і сур'ёзную спякоту. Даволі складанае становішча назіраецца менавіта па ясені. Гэтае дрэва і раней займала ўсяго 0,12 працэнта тэрыторыі ад агульнай плошчы лясоў, а цяпер яно проста гіне. Аднавіць былыя плошчы ясеня будзе вельмі складана, бо тэрыторый са стабільна вільготнымі глебамі ў краіне застаецца ўсё менш.

Эксперты інстытута ўпэўнены, што сасна застанецца галоўнай хвоевай пародай у Беларусі, а вось мяжа арэала елкі адсунецца далей на поўнач.

На свабодных ад елкі тэрыторыях пачнуць вырошчваць сасну, дуб, бярозу і прынцыпова новую для Беларусі расліну — еўрапейскую лістоўніцу. Бярозы ў нашай краіне хапае, таму і кошт на яе драўніну нізкі. Даволі цікавая сітуацыя складаецца з дубам. Ён лічыцца леса-стэпавым відам, таму добрая цеплыня яму, здаецца, да спадобы, але... Старыя дубы вельмі цяжка прывыкаюць да новых кліматычных умоў, а вось маладыя дрэўцы гэтай і іншых ліставых парод сёння растуць нават лепш.

Сяргей КУРКАЧ.

Розгалас

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У СТАЛІЦЫ ПЛАНУЮЦЬ БУДАВАЦЬ КАМЕРЦЫЙНАЕ ЖЫЛЛЁ І ПРАДАВАЦЬ ЯГО ЗА ВАЛЮТУ

У Мінску плануецца будаваць камерцыйнае жыллё і прадаваць яго за валюту. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні Мінгарвыканкама Сяргей Радаман.

Паводле яго слоў, адпаведная прапанова ўнесена кіраўніку дзяржавы. Цяпер падбіраюць 10 пляцовак, на якіх ААТ «МАПІД» можа пабудаваць камерцыйнае жыллё.

«Мы ведаем, што валюта ў насельніцтва ёсць. Мы вырашым з Нацыянальным банкам пытанне аб продажы ўжо гатовага, пабудаванага жылля за валюту. Сёння цана продажу ў горадзе знізілася: камерцыйныя арганізацыі-забудоўшчыкі прадаюць жыллё ад 1100 долараў за 1 кв. м. Калі ААТ «МАПІД» будзе будаваць па 800—900 долараў, думаю, такое жыллё будзе запатрабаваным у насельніцтва», — дадаў Сяргей Радаман.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА, *«Мінск—Навіны»*.

САМАЛЁТ «БЕЛАВІЯ» ЗДЗЕЙСНІЎ ВЫМУШАНУЮ ПАСАДКУ Ў СОЧЫ

Самалёт кампаніі «Белавія», які выконваў рэйс Батумі — Мінск, здзейсніў вымушаную пасадку ў Сочы, паведамляе РІА «Новости».

На гэтыя меры экіпаж паветранага судна пайшоў з-за разгерметызацыі. Яна здарылася на вышыні каля трох тысяч метраў яшчэ ў тбіліскай зоне аэранавігацыі. У 5.00 па маскоўскім часе самалёт вымушана сеў у Сочынскім аэрапорце.

Алена КРАВЕЦ.

КАПСУЛА Ў ФУНДАМЕНТ НОВАГА ХРАМА

У дзень памяці святых дабраверных князёў Барыса і Глеба ў Барыса-Глебскай (Каложскай) царкве прайшлі богаслужэнне і хрэсны ход да месца будаўніцтва новага царкоўна-прыходскага комплекса, паведамляе інтэрнэт-сайт Гродзенскага гарвыканкама.

Епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій у прысутнасці шматлікіх прыхаджан здзейсніў чын асвячэння капсулы, якая закладзена ў фундамент новага храма. Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі старшыня гарвыканкама Барыс Казялкоў і генеральны дырэктар будаўніча-мантажнага трэста № 30 Рыгор Сыраежка — гэтаму прадпрыемству даручана адказная місія ўзвядзення царкоўна-прыходскага комплекса. Ён будзе шматфункцыянальным: акрамя храма ў гонар Каложскай іконы Божай Маці, там размесцяцца нядзельная школа, хрысцільня, бібліятэка, майстэрня і іншыя памяшканні.

Мяркуецца, што пасля пабудовы гэтага комплекса Барыса-Глебская (Каложская) царква будзе зачынена на рэстаўрацыю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ТЭРАРЫЗМ У ПАКІСТАНЕ МЫ НЕ «ПАДСІЛКОЎВАЕМ»

Цэнтр інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі ўчора заявіў, што распаўсюджаная ў асобных СМІ інфармацыя аб пастаўках нашай краінай зброі «тэрарыстычным групоўкам, якія базуюцца ў Пакістане», не адпавядае сапраўднасці, а дакументы, на якія спасылаюцца аўтары публікацыі, — сфальсіфікаваныя.

Як адзначаецца, КДБ Беларусі ў межах сваёй кампетэнцыі паслядоўна рэалізуе сістэму мер па супрацьдзеянні тэрарызму і экстрэмізму, у тым ліку па недапушчэнні паставак спецыфічнай маёмасці на адрас экстрэмісцкіх, тэрарыстычных і іншых незаконных арганізацый. Створаная ў рэспубліцы нацыянальная сістэма экспартнага кантролю тавараў двайнога прызначэння, у склад якой уваходзіць КДБ, цалкам адпавядае рашэнням Савета Бяспекі ААН і выключае любыя парушэнні міжнароднага заканадаўства ў галіне гандлю зброяй. Камітэт дзейнічае строга ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам і міжнароднымі абавязкамі, а значыць, прымае ўсе неабходныя меры для абароны інтарэсаў Рэспублікі Беларусь. Па гэтай праблематыцы арганізавана цеснае і эфектыўнае ўзаемадзеянне з замежнымі партнёрамі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

РЭКІ ДЛЯ СУДНАЎ АБМЯЛЕЛІ

На ўнутраных водных шляхах краіны ўсталяваліся нізкія ўзроўні вады, небяспечныя для суднаходства.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый, каб забяспечыць бяспеку для суднаў, на рэках праводзіцца комплекс днопаглыбляльных ці дноачышчальных работ. Ён вядзецца сіламі чатырох прадпрыемстваў водных шляхоў: рэспубліканскім унітарным Днепра-Дзвінскім прадпрыемствам водных шляхоў «Белвадшлях», РУЭСП «Днепра-Бугскі водны шлях», рэспубліканскім унітарным Днепра-Бярэзінскім прадпрыемствам водных шляхоў, рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам водных шляхоў «Ніжне-Прыпяцкае». Для забеспячэння патрэбы спажыўцоў нярудным будаўнічымі матэрыяламі ў партах створаны іх запас у аб'ёме больш за 616 тысяч тон.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ЛІПЕНІ ВЕТСАНЛАБАРАТОРЫЯ КАМАРОЎСКАГА РЫНКУ ВЫЯВІЛА 4 ПРОБЫ ФАЛЬШЫВАГА МЁДУ

У ліпені лабараторыя ветырынарна-санітарнай экспертызы № 4 Мінскага Камароўскага рынку выявіла 4 пробы падробленага мёду, які набылі з рук і пазней прынеслі для праверкі.

Загадчыца лабараторыі Кацярына Дубікоўская ў гутарцы з карэспандэнтам звярнула ўвагу на тое, што продаж ненатуральнага мёду за рыначнымі прылаўкамі выключаны, таму што штодня перад пачаткам гандлю рэалізатары абавязаны праводзіць экспертызу прадукту: лабараторны талон — гарант якасці — выдаецца толькі ў выпадку пацвярджэння дабраякаснасці тавару.

— Тыя, хто гандлююць за межамі рынку, часта грашаць тым, што верхні слой тавару — уяўляе сабой мёд, а знізу — цукар, — сказала яна.

Наталля РАМАНОЎСКАЯ, *«Мінск—Навіны»*.

БЕЛАРУСКІЯ ТУРЫСТЫ Ў КРЫМЕ СТАЛІ АХВЯРАМІ ВЫМАГАЛЬНІКА

Беларускія і расійскія турысты на адпачынку ў Крыме сталі ахвярамі вымагальніка, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе МУС Украіны.

Паводле інфармацыі праваахоўных органаў Крыма, паведамленні аб вымаганнях паступілі ў міліцыю ад турыстаў, якія прыехалі ў Феадосію. Пакідаючы свае машыны на ноч каля пад'ездаў дамоў, раніцай адпачывальнікі знаходзілі, што з іх аўтамабіляў зніклі дзяржнумары. Ашуканец пакідаў запіску з нумарам мабільнага тэлефона, на які неабходна было пералічыць 500 грыўняў (у пераліку каля $63). Вымагальнік папярэджваў уладальнікаў машын, што ў адваротным выпадку яны не даведаюцца, дзе схаваны нумары.

Усяго з такімі заявамі ў міліцыю звярнуліся пяць грамадзян Беларусі і Расіі. Пры гэтым адзін пацярпелы ўсё ж паспеў папасціся на вуду вымагальніка і пералічыць запатрабаваную суму.

Выйсці на след вымагальніка аператыўнікам удалося даволі хутка. Ім аказаўся 40-гадовы мясцовы жыхар, раней судзімы за крадзяжы з аўтамабіляў. Затрыманы поўнасцю прызнаў сваю віну і быў змешчаны ў следчы ізалятар Феадасійскага гараддзела міліцыі. Супраць яго заведзена крымінальная справа па артыкуле «Вымагальніцтва». Падазронаму пагражае ад трох да сямі гадоў пазбаўлення волі.

ЗАРАБІЛІ НА АЎТО ЗВЫШ 161 МІЛЬЁНА

Глыбоцкім міжраённым аддзелам Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў дачыненні да перагоншчыкаў аўто.

Высветлена, што жыхары райцэнтра аб'ядналіся ў арганізаваную групу і з канца мінулага года па сёлетні ліпень увезлі з краін Балтыі не меней за дзесяць аўтамабіляў, якія прадалі грамадзянам нашай краіны. У выніку атрымалі даход у суме 161,4 мільёна рублёў. А пра неабходнасць легалізацыі такой бізнэс-дзейнасці, падаткі і іншыя нюансы прадпрымальныя гандляры аўто «забылі».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Михаіл МЯСНІКОВІЧ:

«КАМІСІЯ МЫТНАГА САЮЗА ПАВІННА ЎЛІЧВАЦЬ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ, ТАК І НАДНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ»

Камісія Мытнага саюза пры вырашэнні важных пытанняў у рамках тройкі павінна ўлічваць як нацыянальныя, так і наднацыянальныя інтарэсы. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з міністрам прамысловасці і гандлю Расіі, спецыяльным прадстаўніком прэзідэнта Расіі па пытаннях унясення змяненняў у дагавор аб Камісіі Мытнага саюза Віктарам Хрысценкам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы надаём важнае значэнне фарміраванню кіруючых органаў Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, і ў гэтым плане хацелася б, каб улічваліся нацыянальныя і вырашаліся паспяхова наднацыянальныя пытанні, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Калі будзе змешванне функцый, належнай якасці мы не атрымаем». Паводле слоў прэм'ер-міністра, рашэнне аб тым, каб перадаць паўнамоцтвы для вырашэння наднацыянальных пытанняў спецыяльнаму органу, было правільным.

На яго думку, пры надзяленні Камісіі Мытнага саюза паўнамоцтвамі неабходна браць пад увагу магчымасць узнікнення спрэчных пытанняў. «Павінны быць нейкія тармазы, г.зн. калі дзесьці камісія не дамовіцца, павінна быць інстанцыя, якая прымала б канчатковае рашэнне. Я лічу, што гэта наш Міждзяржсавет», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч упэўнены, што члены Камісіі Мытнага саюза павінны быць надзелены асаблівым статусам. «Гэта павінны быць людзі, якія, з аднаго боку, у тэме, душой вітаюць інтэграцыйныя працэсы, і з другога боку, якія пры вырашэнні пытанняў наднацыянальных яшчэ не забываюць, што ёсць пытанні дзяржавы», — растлумачыў ён. У такім духу бакі павінны рухацца і абменьвацца думкамі. «Я лічу, мы маглі б абмяняцца думкамі, у тым ліку ў час маючай адбыцца сустрэчы з Уладзімірам Пуціным сам-насам», — дадаў ён.

У сваю чаргу Віктар Хрысценка падкрэсліў, што бакі нацэлены на тое, каб работу па фарміраванні прававой базы для абноўленай кіруючай структуры, новай камісіі не проста прадоўжыць, а завяршыць за самы кароткі час.

Міністр прамысловасці і гандлю Расіі падтрымаў прэм'ер-міністра Беларусі ў тым, што статус членаў камісіі Мытнага саюза павінен быць даволі высокім. «Статус прадугледжваецца больш чым высокім — гэта статус федэральнага міністра краіны знаходжання», — сказаў ён. Гэта можа служыць добрым стымулам і добрай апорай для прыняцця рашэнняў.

Віктар Хрысценка ў цэлым даў станоўчую ацэнку інтэграцыйным працэсам у рамках Мытнага саюза, адзначыўшы, што яны прынеслі нямала плюсоў і дадатковых магчымасцяў для краін-удзельніц. «Я лічу, ёсць усе стымулы, каб паглыбляць гэтыя інтэграцыйныя працэсы», — рэзюмаваў ён.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.08.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 028,00	1 чэшская крона	295,37
▼ 1 еўра	7 134,23	1 польскі злоты	1 716,83
1 латвійскі лат	10 079,18	▲ 1 расійскі рубель	170,76
1 літоўскі літ	2 071,01	1 украінская грыўня	628,70

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,4452
10 UAH	36,8272
10000 BYR	58,6441
EUR	41,7768

Аўтаматычная тэлефонная станцыя 1-й паверх

16 ЖНІЎНЯ 2011 ГОДА З 14.00 ДА 16.00 АДБУДЗЕЦЦА «ПРАМАЯ ЛІНІЯ» КАМІТЭТА ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ, У ЧАС ЯКОЙ БУДЗЕ ВЫВУЧАНА СІТУАЦЫЯ ПА ГАТОЎНАСЦІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

У ходзе «прамой лініі» жыхары рэспублікі могуць паведаміць інфармацыю пра стан гатоўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы дашкольных устаноў, школ, прафесійна-тэхнічных і іншых навучальных устаноў да пачатку навучальнага года.

Таксама ў грамадзян ёсць магчымасць абазначыць праблемы, якія перашкаджаюць арганізаванаму пачатку навучальнага года.

Тэлефон «прамой лініі» ў Мінску — (017) 328 69 40.

БЕЛАРУСЬ МОЖА ПРЫНЯЦЬ АДЭКВАТНЫЯ МЕРЫ Ў АДКАЗ НА ПАШЫРЭННЕ ЭКАНАМІЧНЫХ САНКЦЫЙ З БОКУ ЗША

Беларускі бок пакідае за сабой права на прыняцце адэкватных мер у адказ на пашырэнне эканамічных санкцый з боку ЗША. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА заявіў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных.

«Мы расцэньваем дзеянні Міністэрства фінансаў ЗША як яшчэ адну ўпушчаную амерыканскім бокам магчымасць праявіць разумны сэнс і сысці з канфрантацыйнага трэку ў нашых узаемаадносінах», — падкрэсліў Андрэй Савіных.

У Беларусі са шкадаваннем адзначаюць, што дзеянні Адміністрацыі ЗША «абмежаваны ўстарэлымі санкцыйнымі клішэ, якія заводзяць у тупік». «Ва ўмовах нарастаючага фінансавага і бюджэтнага крызісу, які паглыбляецца крызісам даверу амерыканскага грамадства да ўлады, Вашынгтон прадаўжае прыняцце мер, што, перш за ўсё, наносяць шкоду інтарэсам амерыканскіх бізнэсменаў, якія выгадна супрацоўнічаюць з беларускімі вытворцамі», — сказаў прэс-сакратар МЗС.

Паводле рашэння Мінфіна ЗША, напярэдадні быў пашыраны спіс беларускіх прадпрыемстваў, з якімі амерыканскім кампаніям і грамадзянам забаронена ажыццяўляць здзелкі. У пералік уключаны ААТ «Белшына», ААТ «Гродна Азот», ААТ «Гроднахімвалакно», ААТ «Нафтан».

Юныя беларускія футбалісты згуляюць на «Санцьяга Бернабеў»

Трапіць на сусветна вядомы футбольны стадыён «Санцьяга Бернабеў» — мара любога футбольнага балельшчыка, згуляць на ім — мара любога футбаліста. Зусім хутка гэтая мара спраўдзіцца ў беларускай каманды футбалістаў-пачаткоўцаў, якім ад 10 да 12 гадоў. Сёлета ўпершыню Беларусь удзельнічае ў Кубку нацый Данон, пераможца якога ад нашай краіны і адправіцца ў Іспанію, на радзіму пераможцаў апошняга чэмпіянату свету, і на стадыёне славутага «Рэала» будзе імкнуцца заваяваць галоўны трафей турніру.

«Кубак нацый Данон» праводзіцца ўжо ў 12-ты раз, і сёлета ў ім удзельнічае 40 краін з 5 кантынентаў. Каля 2 мільёнаў юных футбалістаў прайшлі праз гэты турнір за ўсю гісторыю яго існавання. У адборачных гульнях у Беларусі сёлета ўдзельнічае 8 камандаў, якія прадстаўляюць усе рэгіёны Беларусі. Наймацнейшая каманда вызвіцца 19-20 жніўня на палях САК «Алімпійскі» ў Мінску. А 6-9 кастрычніка яна прадставіць Беларусь у Мадрыдзе.

Пасламі Кубка ад розных краін з'яўляюцца легенды сусветнага футбола: француз Зінэдзін Зідан, іспанец Іньеста, бразілец Кафу, партугалец Дэку. Паслом турніру ў Беларусі стаў галоўны трэнер нашай зборнай Бернд Штанге.

— Я пачынаў гуляць у футбол у 7 гадоў, і гэта было ў невялікай вёсцы, дзе я жыў. У 1954 годзе Германія стала чэмпіёнам свету, і футбол быў марай для ўсіх нас. І мары збываюцца. Я не згуляў у нацыянальнай камандзе, але выступаў у моладзевай. Я дам парады па тактыцы, бо я мяркую, што ведаю, як выйграваць на такіх стадыёнах, як «Санцьяга Бернабеў». Прынамсі, я ведаю, як выйграваць на «Стад дэ Франс», — пажартаваў Бернд Штанге.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЦЯЖКАСЦІ РОСТУ

У Шклове з актывістамі грамадскага аб'яднання «Белая Русь» сустрэўся старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль РУБІНАЎ

Ён падрабязна расказаў пра сітуацыю ў краіне і прычыны цяперашніх цяжкасцяў. Асобнымі тэмамі адкрытай гутаркі сталі эканамічныя рэформы, валютныя праблемы, пытанні прыватызацыі, дачыненні з Расіяй і іншыя.

Разам з тым, Анатоль Рубінаў заклікаў не лічыць цяперашнія цяжкасці нейкай катастрофай: «Ніякага краху эканомікі ў нас няма!»

— Калі ідзе развіццё, то заўсёды ёсць праблемы, — сказаў ён журналістам. — Вось калі памёр, тады праблем няма. Любы арганізм, у тым ліку і грамадскі, калі развіваецца, то заўсёды сутыкаецца з цяжкасцямі, і гэта нармальна. Мы ж вучымся. Не трэба гэта ўсё ўспрымаць як нейкае няшчасце, гэта проста цяжкасці росту. Мы іх пераадолеем, і зробім гэта дастаткова хутка.

Старшыня Савета Рэспублікі перакананы, што не варта драматызаваць сітуацыю:

— Паглядзіце, ну ці дрэнна жыве народ? Нават цяпер, калі цэны павялічыліся. Раней было больш раскошна, але ці бядуе народ зараз? Дзяцей няма чым карміць? Няма ў чым у школу адправіць? Бензін дарагі, але ўсе ездзяць на аўтамабілях. І пад Мінскам кожныя выхадныя паток аўтамабіляў: людзі едуць з гарадскіх кватэр на загарадныя дачы... Часта мы не цэнім таго, што ў нас ёсць. А на самой справе мы шмат чаго маем.

Анатоль Рубінаў сказаў, што сёння на коне, тым не менш, стаіць эканамічная самастойнасць краіны. Быць самастойнымі вельмі няпроста, і таму цяпер шмат чаго залежыць ад адзінства людзей. «Калі мы ўсе будзем выходзіць з інтарэсаў сваёй краіны, тады ўсё будзе добра!»

Анатоль Рубінаў паведаміў у Шклове, што рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» рыхтуецца да ператварэння ў палітычную партыю. Верагодна, што ўжо сёлетняй восенню адбудзецца ўстаноўчы сход.

— Маё адчуванне, што гэта ініцыятыва знізу. Час прыйшоў, і людзі саспелі, каб павысіць сваю палітычную ролю ў грамадстве. Тут ніхто не будзе рабіць па камандзе і прымушаць, бо гэта бессэнсоўна. Наша дзяржава пабудавана на праўдзе і сумленнасці. А стаць партыяй тым больш лагічна, калі краіна сутыкаецца з цяжкасцямі.

Старшыня Савета Рэспублікі мяркуе, што ў сітуацыі, калі вельмі важная кансалідацыя грамадства, патрэбен касцяк, які будзе спрыяць стабілізацыі. Ім і можа стаць новая палітычная партыя.

Анатоль Рубінаў настойліва параіў актывістам «Белай Русі» звярнуць цяпер асаблівую ўвагу на моладзь, якая не памятае цяжкасці ранейшага жыцця, гадавалася ў дабрабыце апошніх часоў. Маладыя людзі ў разгубленасці ад абмежаванняў. Старшыня Савета Рэспублікі мяркуе, што тут дарэчы нагадаць пра патрыятызм. На яго думку, трэба любіць сваю краіну: можа, яна і не самая найлепшая ў свеце, але, як маці, — адзіная родная.

На сустрэчы з Анатолем Рубінавым прысутнічалі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў, старшыня Шклоўскага райвыканкама Аляксандр Бойка, іншыя прадстаўнікі ўлады рэгіёна.

Пётр Руднік у сваёй прамове падтрымаў Анатоля Рубінава і расказаў, што, нягледзячы на цяжкасці, эканоміка рэгіёна працуе нармальна, сітуацыя на спажывецкім рынку пад кантролем.

— Я лічу, што мы цяпер павінны навучыцца наш тавар ператвараць у валюту, — такую задачу ставіць старшыня Магілёўскага аблвыканкама.

Пётр Руднік узгадаў і пра падтрымку маламаёмных: напрыклад, абласная ўлада рыхтуе рашэнне, паводле якога 6 тысяч шматдзетных сем'яў атрымаюць па 500 тысяч рублёў да пачатку навучальнага года.

— Настрой у нас нармальны, працоўны, — дадаў Анатоль Рубінаў. — Мы нашы цяжкасці адолеем.

Ілона ІВАНОВА,
г. Шклоў.

Абзац

◢ **Экіпаж камбайнераў КСУП «Агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна ў складзе Валянціна Саламахі і Аляксандра Граня намалаціў з пачатку ўборкі больш за 3 тыс. т збожжа. Згодна з аператыўнымі звесткамі, гэты экіпаж стаў абсалютным лідарам па намалотах у рэгіёне і ў ліку першых у рэспубліканскім спаборніцтве.**

◢ Сельгаспрадпрыемствы ўсіх формаў уласнасці Віцебскай вобласці прыступілі да аказання дапамогі грамадзянам ва ўборцы збожжавых на прысядзібных участках. Па звестках на 12 жніўня, у гаспадарках насельніцтва скошана амаль 4,7 тыс. га, што складае 23% ад таго, што трэба ўбраць. Сярэдняя ўраджайнасць перавышае 26,7 ц/га.

◢ **На 1 ліпеня г.г. стагадовы рубеж перасягнула 558 жыхароў Беларусі. Прадстаўніцы слабага полу пераважаюць сярод доўгажыхароў — іх больш у 5,3 раза. Так, 100-гадовую планку перасягнула 470 жанчын і 88 мужчын. А ва ўзроставай групе, старэйшай за 110 гадоў, увогуле толькі адны жанчыны (іх 11). Адна з іх, жыхарка Мінскай вобласці, перасягнула 115-гадовы рубеж.**

◢ Няшчасны выпадак адбыўся ў Заводскім раёне Мінска. Манцёр — мужчына 1948 г.н. — праводзіў рамонт паветранай лініі электрапередач і быў смяротна траўмаваны токам. Праверку праводзіць пракуратура.

◢ **На 307-м кіламетры аўтамабільнай дарогі Брэст — Мінск — мяжа РФ адбылося ДТЗ, у якім загінулі тры пасажыры мікрааўтобуса. Паводле папярэдніх звестак, аўтамабіль вяртаўся з шоп-тура з Польшчы. Кіроўца заснуў падчас руху. За рулём аўтамабіля «Форд Транзіт» знаходзіўся 23-гадовы мужчына. Машына з'ехала ў кювет і ўрэзалася ў дрэва. У выніку жанчыны 1960, 1967 і 1977 гадоў нараджэння загінулі на месцы здарэння, а яшчэ 4 чалавекі атрымалі траўмы.**

◢ Два пасажыры цягніка «Гомель — Санкт-Пецярбург» пабілі пяць чалавек. Па звестках міліцыі, 28-гадовы гамяльчанін, які працуе ў адной з фірмаў у Расіі, а таксама яшчэ адзін 21-гадовы жыхар Гомеля — менеджар беларускай фірмы — беспадстаўна збілі трох праваднікоў і двух пасажыраў. Абодва падазроныя знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. У дачыненні іх заведзена крымінальная справа.

Поўны абзац

◢ **Кампанія-вытворца спартыўных тавараў Adidas устанавіла на адной са станцый метрапалітэна ў Шанхаі гіганцкія баксёрскія грушы, на якіх стомленыя, злыя або п'яныя пасажыры могуць вымесціць свае пачуцці і агрэсію, замест таго, каб рабіць гэта на супрацоўніках метро ці іншых пасажырах. Надпіс на грушах сведчыць: «Кожны год вам даводзіцца чакаць на платформе 1 824 хвіліны. Не губляйце часу, стукніце грушу, скіньце напружанне!»**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Сноўскія дажынкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Хлебаробы агракамбіната «Сноў» Нясвіжскага раёна аднымі з першых у краіне завяршылі жніво. А яно ішло больш чым на 2,5 тысячы гектараў. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых склала 71 цэнтнер з гектара. Некаторыя ўчасткі хлебнай нівы парадавалі ўраджайнасцю ў 93 цэнтнеры. На сноўскіх дажынках з асаблівым гонарам шанавалі лепшых камбайнераў і шафёраў: Віктара КАРПОВІЧА (на фотаздымку справа), які намалаціў без малога дзве тысячы тон збожжа, Вячаслава ШАРАПУ, намалот якога склаў 1,7 тыс. тон і Уладзіміра КАПЫТКУ (на фота злева), які намалаціў больш за 1,5 тысячы тон. А сноўскі вадзіцель Вячаслаў ЗАХАРАЎ прызнаны лепшым на Міншчыне на перавозцы новага хлеба. Яго рэкорд — 2,5 тысячы.

Міхаіл КАВАЛЁЎ: **Думка эксперта**

«ДОЛАРАВАЯ ІНФЛЯЦЫЯ ІДЗЕ ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ»

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standart & Poor's панізіла крэдытны рэйтынг ЗША на адну ступень. Праз гэта занепакоіліся ўсе эканамісты і эканомікі свету. Ці паўплывае гэта неяк на Беларусь? Можа быць, варта пераводзіць долары ў нейкую іншую валюту? Ці надыходзіць канец вяршэнства ў свеце Злучаных Штатаў? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з дэканам эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прафесарам Міхаілам КАВАЛЁВЫМ.

— Што зараз адбываецца ў Амерыцы? Як гэта ўвогуле можна растлумачыць: наступствы папярэдняга крызісу 2007-2008 гадоў ці гэта ўжо штосьці новае?

— Праблемы ў ЗША — гэта вынік таго, што на працягу дзесяцігоддзяў Амерыка жыла не па сродках. Амерыка, карыстаючыся статусам краіны, якая эмітуе сусветную рэзервовую валюту, заўсёды друкавала вельмі шмат долараў. За іх амерыканцы куплялі за мяжой тавары. Гэтыя грошы, якія даставаліся іншым краінам, пасля ўсё роўна вярталіся ў ЗША праз уклады ў амерыканскія ўрадавыя аблігацыі. Вельмі доўга гэтая мадэль паспяхова функцыянавала. Да крызісу 2008 года. Празмернае захапленне амерыканцаў друкаваннем долараў прывяло да таго, што пачалася інфляцыя спачатку на сусветных фондавых рынках, потым на сыравінных і ў канчатковым выніку ў саміх ЗША. Цэны на асноўныя сыравінныя тавары і золата, як і раней, каціруюцца ў доларах ЗША, але паколькі долараў друкуецца вельмі шмат, увесь свет адчуў цяпер, што значыць эмісія (*выпуск у абарачэнне новых грошай, які прыводзіць да павелічэння сусветнай грашовай масы*. — **Аўт.**).

Можа, не ўсе памятаюць, што калісьці барэль нафты каштаваў дзесяць долараў. Сёння ён часам зашкальвае за сто долараў. Калі стварыўся Міжнародны валютны фонд, існаваў залаты стандарт: адзін грам золата быў роўны аднаму долару. Сёння гэта ў шмат разоў больш. Давайце падлічым: унцыя золата (каля 31,1 грама) каштавала прыкладна столькі ж долараў, а сёння яна ўжо каштуе больш за 1700 долараў. Але доларавая інфляцыя ідзе не аднолькава па ўсіх таварах. Па харчовых таварах яна ўвесь час імкнецца ўверх, бо свету не хапае харчавання. Па нафце яна то скокне, то апусціцца. І гэта прымушае напружвацца ўвесь свет. Зразумела, што ўскосна ваганне сусветных цэн уплывае і на Беларусь. Калі цэны на харч растуць, для Беларусі гэта добра. Калі ж растуць цэны на нафту, газ — гэта ўжо дрэнна для Беларусі.

Ёсць яшчэ адна прычына амерыканскіх праблем: з'яўленне другога моцнага полюса ў свеце — Кітая. Па прагнозе МВФ, да 2016 года эканоміка Кітая стане большай за эканоміку ЗША і аб'яднаfar Еўропы. Але галоўнае, што, пастаўляючы танныя тавары амерыканцам, кітайцы назапасілі такую колькасць золатавалютных рэзерваў (тры трыльёны долараў), што сёння, калі б яны захацелі, у адно імгненне маглі б абрынуць долар у большай ступені, чым гэта адбылося ў сакавіку з беларускім рублём.

Зразумела, што кітайцы, якія прадбачылі сённяшнюю сітуацыю, патрошкі пазбаўляюцца долараў. Яны купляюць еўра, золата, карысныя выкапні. Яны скупілі практычна ўсе карысныя выкапні ў Паўднёвай Афрыцы, тое-сёе купілі ў Казахстане, імкнуцца штосьці купляць і ў Беларусі. Таксама яны проста інвестуюць, выкарыстоўваюць свопсхемы (*абмен нацыянальнымі валютамі*. — **Аўт.**), разумеючы, што долар сёння — вельмі ненадзейная валюта.

Таму тое, што Standart & Poor's панізіла крэдытны рэйтынг ЗША, заканамерна. Аднак гэты рэйтынг па-ранейшаму застаецца вельмі высокім. Беларусі пра такі можна толькі марыць. Але я думаю, што ён будзе яшчэ ніжэй. Аб гэтым намякнула і Standart & Poor's. Яно сказала, што Злучаным Штатам спатрэбяцца дзясяткі гадоў, каб аднавіць той рэйтынг, які быў. Калі б былі насамрэч незалежныя рэйтынгавыя агенцтвы (проста ўсе сусветныя рэйтынгавыя агенцтвы і належаць ЗША), то, мне здаецца, рэйтынг Злучаных Штатаў быў бы сёння яшчэ ніжэйшы. Зніжэнне рэйтынгу — гэта наступства таго, што дзяржаўны доўг ЗША ўжо перавысіў ВУП. Калі дзяржаўны доўг перавышае гадавы ВУП, гэта ўжо выпадак Грэцыі, Партугаліі, Іспаніі. Можам параўнаць з Беларуссю: нават з улікам дэвальвацыі гэты доўг дзесьці на ўзроўні паловы ВУП.

— Непасрэдна з ЗША мы не звязаны. Але ж глабалізацыя існуе і на нас гэта ўсё нейкім чынам павінна паўплываць.

— У нас не такія вялікія золатавалютныя рэзервы, і яны дыверсіфікаваныя (*дыверсіфікацыя — разгрупаванне капіталу паміж рознымі аб'ектамі ўкладанняў*. — **Аўт.**). Большасць сваіх рэзерваў Беларусь трымае ў золаце. Мы назапасілі амаль трыццаць тон золата і на гэтым вельмі выйгралі: куплялі золата, калі яно каштавала меней за 1000 долараў за ўнцыю, а сёння яна каштуе 1700 долараў. І я думаю, што калі б мы рызыкнулі хоць частку золата закласці ці прадаць, то не было б праблем сённяшніх і з дэфіцытам валюты. Але кіраўніцтва краіны вырашыла, бачачы, якая складаная сітуацыя ў сусветных фінансах, трымаць золата.

Тым не менш, я не сказаў бы, што агульная сітуацыя ў свеце не ўплывае на Беларусь. Мы бачым, як яна паўплывала ў 2008 годзе, калі сусветны крызіс распаўсюдзіўся на наш асноўны рынак — расійскі. Расія стала істотна менш купляць імпарту. І таму наш эксперт у 2009 годзе быў амаль на сорак працэнтаў меншы, чым да крызісу. Таму, калі панікі на фондавых рынках перакінуцца на фондавы рынак Расіі, калі Расія пачне зноў менш тавараў купляць за мяжой, то, безумоўна, гэта паўплывае і на Беларусь. Аднак трэба адзначыць, што мы ў апошні час сталі больш дыверсіфікаваць нашы рынкі. Мы зараз прадаём, напрыклад, мінеральныя ўгнаенні і ў Кітай, і ў Індыю, і ў Лацінскую Амерыку, і ў Еўропу. Нават калі крызіс паўторыцца, я думаю, што зараз гэта будзе ў больш мяккай форме, чым было ў 2009-м. Хоць і ёсць нейкія пазіцыі, якія залежаць ад сусветных тэндэнцый: напрыклад, рынак нафтапрадуктаў.

— Што будзе, калі знізяцца цэны на нафту і Расія страціць шмат грошай?

— Я не думаю, што Расія страціць вялікія грошы. Цэны на нафту могуць знізіцца, але не ў значнай ступені. Па меры таго, як Расія будзе адмаўляцца ад прадыктаванай мадэлі і больш будзе браць прыклад з Кітая, яна будзе менш залежаць ад сусветных катаклізмаў. Адзначу, што, калі Расія становіцца бядней, яна з большым задавальненнем купляе танныя беларускія тавары. Таму гэта нам нават у нейкай ступені выгадна. Калі ж Расія багатая, яна ахвотней купляе дарагія еўрапейскія тавары. Таму тут сітуацыя двухсэнсоўная. І я лічу, што калі нават фондавы рынак Расіі ўпадзе, яго глыбіня не будзе такой жа вялікай, як у 2009 годзе. І не думаю, што гэта істотна паўплывае на экспарт беларускіх тавараў.

Некаторыя памыляюцца, думаючы, што наша краіна вельмі залежыць ад цаны на нафту. На самай справе гэта не так, таму што тыя грошы, якія плацім за нафту, мы «адбіваем» на экспарце нафтапрадуктаў. Мы больш адчуваем нафтавыя пошліны і нейкія там выдуманыя Расіяй прэміі за нафту з-за таго, што нашы нафтаперапрацоўчыя заводы больш сучасныя, чым расійскія. Мы з кожнай тоны нафты сёлета плацім Расіі дадаткова сорак пяць долараў, што зусім несправядліва. На жаль, з цаною на нафту звязана і цана на газ, прычым са спазненнем: нафта ўжо можа стаць таннай, а газ яшчэ нейкі час будзе дарагім. Павінна быць аднолькавая цана на газ і для расіян, і для беларусаў з улікам транспарту. Няхай яна нават будзе сусветная, але важна, каб яна была аднолькавая. Інакш, у межах адзінай мытнай прасторы, абараніцца мытнымі пошлінамі мы не можам.

— А чаму амерыканскія дзяржаўныя аблігацыі пакуль па-ранейшаму засталіся «мацнейшымі» за аналагічныя еўрапейскія паперы?

— Штаты спрабуюць запэўніць, што па-ранейшаму казначэйскія аблігацыі ЗША — надзейны інструмент. Для гэтага спадарыня Клінтан бесперапынна лятае ў Кітай і пераконвае кітайцаў. Але найлепшы доказ таго, што гэта не так — дзеянні кітайцаў. З трох трыльёнаў золатавалютных рэзерваў зараз у аблігацыях ЗША яны трымаюць менш за адзін трыльён. У іх атрымалася любымі спосабамі паціху зменшыць гэтую долю. І я думаю, што рана ці позна многія іншыя краіны свету, якія дагэтуль трымаюць золатавалютныя рэзервы ў аблігацыях ЗША, таксама ўсё зразумеюць і пойдуць услед за Кітаем. Лепш укладваць грошы ў інвестыцыйныя праекты за мяжой, распрацоўку новых карысных выкапняў.

Праблемы ж з недаверам да еўра і еўрааблігацый — гэта вынік манаполіі на фінансавую інфармацыю ў ЗША. Амерыцы хацелася б, каб у Еўропе справы былі яшчэ горш, чым у ЗША. Знешні доўг Еўрасаюза, без уліку ўзаемных даўгоў краін саюза адзін аднаму, значна меншы, чым у ЗША. Вельмі часта праблемы Еўрасаюза перабольшваюць. Краіны саюза ў меншай ступені абавязаны, чым ЗША.

ЗША і Еўрасаюз — ахвяры глабалізацыі, якую самі яны і стварылі. Гэтыя дзяржавы не надта кантралявалі свае транснацыянальныя карпарацыі, якіх цікавіў толькі прыбытак. У выніку практычна ўсе заводы аказаліся вынесенымі з Еўропы і ЗША ў Кітай. Яны думалі, што хопіць і інтэлектуальнай рэнты. Але калі заводы вынесены, іх вопыт, іх тэхналогіі паціху пераходзяць да тых краін, дзе прадпрыемствы знаходзяцца. І сёння ўжо кітайцы самі могуць збіраць самалёты, ракеты, аўтамабілі. І надыдзе той дзень, калі ў іх з'явяцца і асабістыя інавацыі, і асабістыя тэхналогіі.

На маю думку, Еўропе трэба арыентавацца на Расію. Стварацьна базе расійскіх сыравінных рэсурсаў сумесныя вытворчасці. Таму што паасобку ні Расія, ні Еўрасаюз, як мне ўяўляецца, у бліжэйшай будучыні не змогуць супрацьстаяць Кітаю. Ну, а Беларусь — гэта мост паміж Расіяй і Еўропай. І я заўсёды выстаўляў лозунг: разам з Расіяй шчыльней інтэгравацца з Еўрасаюзам. Зараз сусветная гісторыя знаходзіцца на чарговым павароце. У канцы мінулага стагоддзя адбыўся распад сацыялістычнага лагера. Гэта была фенаменальная падзея. А вось XXI стагоддзе пачынаецца, на мой погляд, з насамрэч рэвалюцыйных сусветных трансфармацый. Адбываецца новы цывілізацыйны паварот: узвышэнне Кітая і захад ЗША, што дае новы шанц еўрапейцам і расіі. А для Беларусі, як і ў сярэднявеччы, сяброўства Еўропы і Расіі — гэта шанц для эканамічнага развіцця.

— Ці варта людзям зараз хуценька пераводзіць свае долары, напрыклад, у еўра?

— Я думаю, што на тых адрэзках часу, на якіх мы зберагаем грошы (год, нават пяць гадоў) істотнага значэння гэта не мае. Сёння вышэйшы долар, заўтра вышэйшае еўра ці наадварот. На жаль, пакуль няма яшчэ традыцыі захоўваць грошы ў юанях. Калі трэба захоўваць грошы больш працяглы час, чым пяць гадоў, то лепш гэта рабіць менавіта ў юанях.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 14 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Наименование и характеристики продаваемого имущества	Склад (литер Ж 1/м) общей площадью 486,3 кв. м, инвентарный номер 500/С-54147
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Корженевского, д. 14, корп. 3
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск
Балансодержатель	РУП «Завод «Электроника», ул. Корженевского, 14, (к. 416), 220108, г. Минск
Начальная цена	889 134 000 белорусских рублей
Сумма задатка	88 000 000 белорусских рублей

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **14 сентября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.08.2011 по 12.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017) 212 39 11 – УП «Завод «Электроника».

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 26.09.2011 открытого аукциона по продаже конфискованного имущества

Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Квартира № 14, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Короткевича, 12, общей площадью 55,1 кв.м, общей площадью по СНБ 62,2 кв.м, жилой площадью 32,2 кв.м (двухкомнатная, расположена на 5 этаже)
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена	373 445 000 белорусских рублей
Сумма задатка	37 000 000 белорусских рублей

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **26 сентября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.08.2011 по 22.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36;
сайт: www.mgcn.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 24.08.2011 открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Дары моря»

Номер предмета торгов	**1**	
Продаваемое имущество	**Наименование**	**Инв. №**
	горка пристенная	8
	горка торцевая	9
	стеллаж пристенный с посв. 2200*650	933
	стойка дополнительная 2200*80	1585
	весы ВТМ-600	12017
	телефонный аппарат «Панасоник»	52
	Умывальник бел.	54
	Факс	58
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	3 974 730 белорусских рублей	
Сумма задатка	397 473 белорусских рубля	
Номер предмета торгов	**2**	
Продаваемое имущество	**Наименование**	**Инв. №**
	стол компьютерный	43
	стол компьютерный с надставкой с хром. опорой	123
	шкаф книжный (2 шт.)	62
	шкаф-купе	63
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	1 982 027 белорусских рублей	
Сумма задатка	198 203 белорусских рубля	
Номер предмета торгов	**3**	
Продаваемое имущество	**Наименование**	**Инв. №**
	стол производственный 600*600*860	1554
	стол производственный 950*600*860	1556
	стол производственный	45
	тележка ШП-100	51
	льдогенератор GB902 A-Q G220-240в 550Вт	120370
	шкаф В-Т ШВ-0-44-00 Атлант	12008
	морозильный ларь гориз. GTI 3003	120292
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	11 229 257 белорусских рублей	
Сумма задатка	1 122 926 белорусских рублей	
Номер предмета торгов	**4**	
Продаваемое имущество	**Наименование**	**Инв. №**
	шкаф-витрина ШК.04 РБ	12009
	морозильная витрина Двина-120	11006
	камера холодильная КХС 8,81 (1,96*2,56*2,20)	120022
	машина холодильная моноблочная ММ-11А	12001
	камера холодильная КХН 7,71 (2,16*1,96*2,20)	12003
	машина холодильная моноблочная МВ-09А	120002
	стол-тумба проф-й со встр. цельн. Ванной 1500*600*860	120453
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	38 599 000 белорусских рублей	
Сумма задатка	3 859 900 белорусских рублей	
Номер предмета торгов	**5**	
Продаваемое имущество	**Наименование**	**Инв. №**
	настольная вакуумная упак. машина VP 370T	120507
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	11 194 000 белорусских рублей	
Сумма задатка	1 119 400 белорусских рублей	
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Комсомольская, д. 8	
Сведения о собственнике (продавце)	ОАО «Дары моря», ул. Комсомольская, 8, 220030, г. Минск	
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36	

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Дары моря», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявку на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка (по каждому предмету торгов, на который подается заявка); а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583 в срок по 22.08.2011 включительно.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Минимальная величина первого шага составляет пять процентов начальной цены предмета торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения а

Крызісныя з'явы ў эканоміцы краіны, якія праявіліся апошнім часам, а пры гэтым яўнае скарачэнне бюджэтнага фінансавання будаўніцтва, па сутнасці, зусім не паўплывалі на дзейнасць Слуцкай СПМК-122 (спецыялізаванай перасоўнай механізаванай калоны), спецыялісты якой выконваюць на аб'ектах новабудоўлі мантаж і ўвод у дзеянне сістэм гарачага і халоднага водазабеспячэння, ветыляцыі, сістэм ацяплення і каналізацыі, газазабеспячэння... «Працы — хоць адбаўляй, — зазначыў падчас сустрэчы кіраўнік СПМК-122 Мікалай Мінакоўскі. — Заказамі забяспечаны на 120—130 працэнтаў да сваіх магутнасцяў. Асноўныя аб'екты — жыллё... Аб'ёмы ёсць, выпрацоўка ёсць, рэнтабельнасць — ёсць...». Працаўнікі СПМК-122, як зразумела ўжо, не займаюцца чыста агульнабудаўнічымі работамі і прыходзяць на аб'екты, як правіла, у якасці субпадрадчыкаў; задача працаўнікоў СПМК-122, нагадаем, — забяспечыць гэтыя аб'екты ўсёй неабходнай інжынернай інфраструктурай для іх далейшай нармальнай жыццядзейнасці. Словам, спецыялісты СПМК як бы ўносяць апошнія штрыхі ў будаўніцтва таго ці іншага аб'екта.



Перспектыва — толькі адна: РАЗВІВАЦЦА. А значыць — і БУДАВАЦЬ

Слуцкая СПМК-122

Слуцкая СПМК-122, па спецыфіцы сваіх работ, закрывае будаўнічую зону 5 раёнаў вобласці: зразумела, Слуцкага раёна, а таксама Любанскага, Капыльскага, Стаўбцоўскага, Пухавіцкага. За апошні месяц выкананa будаўніча-мантажных работ уласнымі сіламі на суму каля мільярда рублёў, што нямала для параўнальна невялікага калектыву, а ў мехкалоне працуе крыху больш за 100 чалавек. За леташні год Слуцкая СПМК-122 прыбавіла ў сваіх аб'ёмах больш за 20 працэнтаў, сёлета тэмпы росту (па звестках за паўгоддзе) складаюць 151 працэнт. Выдатныя тэмпы. Працуюць у мехкалоне з рэнтабельнасцю 5,2 працэнта.

Што садзейнічае ў цэлым даволі паспяховай працы калектыву? Безумоўна, у першую чаргу яе належная арганізацыя, а таксама рытмічнае, дакладнае забеспячэнне аб'ектаў, што ўзводзяцца, неабходнай камплектацыяй для мантажу тых жа сістэм інжынернай інфраструктуры. («Практычна працуем з колаў», — падкрэслівалі тут, маючы на ўвазе свае даволі сціслыя плошчы для таго, каб захоўваць на іх, скажам, сантэхніку для будучых кватэр), ды яшчэ цеснае ўзаемадзеянне з генеральнымі падрадчыкамі і заказчыкамі аб'ектаў, ды, безумоўна, прафесіяналізм кадраў.

Прадставім асобных спецыялістаў мехкалоны. Тым больш для гэтага ёсць добрая нагода: 14 жніўня будаўнікі краіны будуць адзначаць сваё прафесійнае свята. І пачнём наша знаёмства з майстра Алены Катовіч, якая разам са сваімі падначаленымі была занята абуладкаваннем сістэм інжынернай інфраструктуры на толькі што ўзведзеным доме па вуліцы Чэхава ў Слуцку. Як нам яе прадставілі, перспектыўны спецыяліст, добра разбіраецца ў чарцяжах, хоць і працуе, пасля заканчэння Мінскага архітэктурна-будаўнічага каледжа, усяго год з хвосцікам. А галоўнае — умее ладзіць з людзьмі, якімі кіруе. Сама ж Алена Катовіч яўна задаволена і выбранай прафесіяй (хоць гэтая прафесія, як быццам, і не зусім жаночая), і цяперашняй працай (зрэшты, сама Алена лічыць, што ўся сутнасць тут не ў самой прафесіі, а ў стаўленні да справы, і ўвогуле, не адны мужчыны здольныя інжынерную кемлівасць выказваць, якая так патрэбна ў гэтай справе)... Ці складаны цяперашні аб'ект?

— Ды вось падключылі да дома халодную ваду ад знешніх сетак, будзем «разводзіць» па кватэрах. Потым чакаюць работы па забеспячэнні кватэр газам, ацяпленнем і г.д., па ўстаноўцы ў іх лічыльнікаў. Увогуле, звычайная праца. Галоўнае, каб яна была выканана якасна, каб яе потым без заўваг прынялі спецыялісты тэхнагляду... Плануем у кастрычніку дом здаць.

Сучасныя нормы пры наступнай эксплуатацыі жылля маюць на ўвазе не толькі ў вялікіх будаўнічых арганізацыях, але і ў невялікіх, мясцовых, у тым ліку і ў Слуцкай СПМК-122. У прыватнасці, цяпер у кожнай з кватэр абавязковыя не толькі лічыльнікі па расходаванні гарачай і халоднай вады, але і цяпла. А гэта значыць, што ў доме, які забяспечваюць адпаведнай інжынернай інфраструктурай будаўнікі брыгады Алены Катовіч, толькі лічыльнікаў належыць устанавіць тры сотні (у 100 кватэрах). Працаёмістая і адказная справа, шматлікія пры гэтым зварныя злучэнні потым дэталёва праверацъ спецыялісты тэхнагляду пры прыёмцы дома — на трываласць, на шчыльнасць і г.д.

Праараб Аляксей Санько кіруе работамі на іншым доме, які таксама ўзводзіцца ў Слуцку і які павінны былі вось-вось здаць: тут справа падыходзіла ўжо да канчатковага завяршэння. Гэта былі практычна ўсё тыя ж работы па забеспячэнні кватэр адпаведнай інжынернай інфраструктурай. Аляксея Санько ў Слуцкай СПМК-122 таксама называюць адказным і перспектыўным спецыялістам. Зрэшты, ён ужо мае неблагі вопыт, які набыў у іншай арганізацыі, а ў СПМК-122 прыйшоў не так даўно. І, як тут спадзяюцца, павінен замацавацца канчаткова.

Аднак пазнаёмімся яшчэ з адным са спецыялістаў Слуцкай СПМК-122 — майстрам Сяргеем Чэркасам, які разам са сваёй брыгадай працаваў у Любанскім раёне, на рэканструкцыі 27-кватэрнага жылога дома ў СВК «Асавец-агра». Гэта адно з найбольш аддаленых месцаў, дзе працуюць цяпер спецыялісты СПМК-122. Адпаведна, гэта ж накладвае большую адказнасць і на кіраўніка работ, які ў нярэдкіх выпадках павінен прыняць цалкам самастойнае рашэнне, так бы мовіць, на месцы. Як характарызавалі Сяргея Чэркаса, ён умее добра арганізаваць працу, умее адстойваць свой пункт погляду і вытворча-тэхнічны аддзел можа паўшчуваць, калі што не так... Увогуле, моцны праараб.

— Вось паглядзіце на суседні дом, побач, — казаў сам Сяргей Чэркас. — Увесь абшарпаны, з адбітай тынкоўкай. А яшчэ зусім нядаўна такі ж непрывабны выгляд меў і той дом, які мы рэстаўруем. Ставім у кватэрах катлы для індывідуальнага ацяплення, якія будуць працаваць на цвёрдым паліве, устанаўліваем новыя вокны, сантэхнічнае абсталяванне. Практычна заканчваем. Кватэры атрымаюцца не горшыя за новыя. Як той казаў, варта толькі рукі прыкласці...

Можна меркаваць, рукі на гэтым доме, у тым ліку і ранейшыя будаўнікі, што выконвалі агульнабудаўнічыя работы, прыклалі няблага.

Варта тут жа дадаць: менавіта Сяргей Чэркас кіраваў работамі на найбольш маштабным за апошні час аб'екце, на якім шчыравалі працаўнікі Слуцкай СПМК-122, — фізкультурна-аздараўленчым комплексе ў Любані, што даволі працяглы час знаходзіўся ў ліку доўгабудаў. Каля года таму звярнулі на яго належную ўвагу, а зусім нядаўна ён нарэшце ўведзены ў эксплуатацыю.

* * *

Аднак спынімся больш дэталёва на апошнім аб'екце. І адразу ж адзначым: вельмі прадстаўнічым, прыгожым ён атрымаўся. Спартыўная зала комплексу займае каля 800 квадратных метраў, у ёй можна займацца многімі відамі спорту, праводзіць розныя турніры і спаборніцтвы. Тут, на другім паверсе, абуладкаваны таксама і трыбуны для балельшчыкаў. Гэта, аднак, толькі адна частка комплексу, а ад яе пераходная галерэя вядзе да вялізнага плавальнага басейна. Якое дачыненне да ўсяго гэтага маюць спецыялісты Слуцкай СПМК-122? А іх работы на гэтым аб'екце складаюць вельмі значную долю: каля 30 працэнтаў. На іх рахунку поўнае абуладкаванне санітарна-тэхнічных памяшканняў са шматлікімі вентыляцыйнымі паветраправодамі, а таксама сістэмамі пажаратушэння, каналізацыі і г.д., а яшчэ — з датчыкамі назірання за гэтымі сістэмамі. Адным словам, цікавы аб'ект, толькі быў бы ён заўсёды запоўнены, прыносіў карысць, належную аддачу...

На жаль, пры ўсім гэтым мы не можам нічога не сказаць і пра іншае — пра вядомую лыжку дзёгцю ў бочцы мёду. Не абышлося без гэтай лыжкі і тут, і, дарэчы, гэтая лыжка ўнесена не працаўнікамі СПМК-122, а тымі, хто выконваў агульны мантаж гэтага ўнікальнага збудавання. Якраз падчас яго наведвання над Любаншчынай праліўся моцны лівень, і ён з'явіўся найлепшым экзаменатарам для будаўнікоў, яшчэ раз нагадаем — для «агульных» будаўнікоў. Добра вядома, найбольш балючае месца ў розных аб'ектах і збудаваннях — стыкі паміж іх элементамі. Менавіта стыкі, так бы мовіць, яўна «падмачылі» ўсю прыгажосць аб'екта і цяпер. І, адпаведна, рэпутацыю тых будаўнікоў, якія выконвалі на комплексе агульныя будаўніча-мантажныя работы. Шкада, што гэткім чынам даводзіцца завяршаць нашу экскурсію на гэты, яшчэ раз падкрэслім, вельмі цікавы аб'ект.

* * *

Як і праца іншых будаўнікоў, праца спецыялістаў Слуцкай СПМК-122 знаходзіцца пад пільным кантролем дзяржаўных органаў нагляду. І гэты кантроль, можа, нават больш жорсткі, чым для іншых. Гэтага патрабуе сама спецыфіка работ, якія выконваюць у СПМК-122, напрыклад, выкананне зварачных злучэнняў пры абуладкаванні ў дамах газавых сістэм. Дарэчы, выкананне такіх работ патрабуе і наяўнасці спецыялістаў высокага класа. Як падкрэсліваюць у СПМК-122, асаблівых прэтэнзій да іх працы ў тых жа органаў нагляду няма.

І няхай будзе так і надалей. А разам з тым няма асаблівых прэтэнзій і непасрэдна ў спажыўцоў, у забудоўшчыкаў. Спынімся на гэтым моманце. У мехкалоне, як можна меркаваць, імкнуцца ўсяляк улагодзіць будучых уладальнікаў кватэр. Напрыклад, такі факт, пра які паведаміў праараб Аляксей Санько: перад тым, як пачаць інжынернае абуладкаванне «яго» дома ў Слуцку, спецыялісты мехкалоны разам з будучымі навасёламі абмеркавалі, якое яны ў гэтым доме хацелі б бачыць сантэхнічнае абсталяванне, пры гэтым старшыня кааператыва з адпаведнай мэтай нават з'ездзіў у Мінск на «Керамін».

Ужо ў іншым выпадку ў мехкалоне пры азнаямленні з праектам знайшлі наступную нязручнасць: трубы на кухні адной з сістэм інжынернай інфраструктуры былі «размешчаны» такім чынам, што будучаму ўладальніку кватэры было б нязручна вешаць шафкі. Пераўзгаднілі праект. А яшчэ ў адным з праектаў не было прадугледжана падключэнне ў ванных пакоях пральных машын. Таксама пераўзгаднілі... Вышэй было сказана пра кантроль за працай будаўнікоў з боку органаў дзяржнагляду — гэтых вельмі строгіх экзаменатараў. У Слуцкай СПМК-122 лічаць будучых гаспадароў кватэр не менш строгімі экзаменатарамі і вельмі ўважліва прыслухоўваюцца да ўсіх іх прэтэнзій і пажаданняў. З імі тут — у пастаянным кантакце.

* * *

У Слуцкай СПМК-122 хочуць развівацца далей. І з надзеяй паглядваюць ад свайго адміністрацыйнага будынка цераз вуліцу, на другі яе бок, дзе стаяць закінутыя вытворчыя памяшканні адной са слуцкіх арганізацый — гэтыя памяшканні хочуць перадаць мехкалоне. «Хутчэй бы, — зазначаюць тут. — Мы б у гэтых памяшканнях наладзілі вытворчасць металапрофілю, які цяпер запатрабаваны, а галоўнае — выраблялі б тут вадасцёкавыя сістэмы, лаўкі, сметніцы і іншыя прадметы ўнутрыдворавага абуладкавання, якія цяпер даводзіцца купляць. Наладжванне іх вытворчасці непасрэдна ў сябе станоўча паўплывала б і на кошты на нашы будаўнічыя паслугі, дазволіла б мехкалоне працаваць з яшчэ большай прыбытковасцю.

* * *

А ўвогуле, у Слуцкай СПМК-122 не цураюцца ніякай работы, імкнуцца менавіта зарабіць. Напрыклад, тут, разам з выкананнем работ згодна з заказамі генеральных падрадчыкаў, шукаюць і свае непасрэдныя заказы. У пераліку кірункаў дзейнасці мехкалоны і такі, крыху непрывычны для яе спецыфікі, як выкананне дахавых работ.

А адным з даволі прыбытковых відаў дзейнасці сталі аўтамабільныя паслугі, для іх аказання тут нават атрымалі спецыяльную ліцэнзію. Для аказання такіх паслуг у мехкалоне маюць свае МАЗы — аўтасамазвалы, 30-тонны МАЗ-цягач для перавозкі цяжкай будаўнічай тэхнікі, 25-тонны аўтакран, аўтавышку з вышынёй пад'ёму да 28 метраў, два амкадораўскія экскаватары для выканання земляных работ, траншэекапальнік. На прадастаўленні аўтапаслуг (у асноўным для будаўнічых арганізацый) у мехкалоне зарабляюць каля 60 мільёнаў рублёў за месяц. Зразумела, гэта ў параўнанні з будмантажом (нагадаем: каля мільярда рублёў за апошні месяц) не так ужо і шмат. Тым не менш — таксама пэўны ўнёсак у агульныя даходы калектыву.

* * *

А на заключэнне невялікае інтэрв'ю з **дырэктарам мехкалоны Мікалаем МІНАКОЎСКІМ,** пры гэтым спачатку прадставім яго.

Мікалай Мінакоўскі мае неблагі будаўнічы вопыт, працаваў у розных будаўнічых арганізацыях. Пачынаў у 1984 годзе майстрам, працаваў прарабам, галоўным інжынерам (у СПМК-97), дырэктарам ПМК-230; доўгі час знаходзіўся на пасадзе намесніка старшыні па будаўніцтве Слуцкага раённага спажывецкага таварыства, прычым у той гарачы час, калі Слуцк рыхтаваўся да рэспубліканскіх Дажынак. Адпаведна, як зазначае Мікалай Мінакоўскі сам, прайшоў ён за гэты час вельмі добрую школу. На цяперашняй пасадзе — са жніўня 2008 года...

— Мікалай Міхайлавіч, вы зазначалі, што маеце нямала заказаў, нават больш за магутнасці сваёй арганізацыі. Як у такім разе збіраецеся іх выконваць? І яшчэ: назавіце асноўныя аб'екты на сёлетні год.

— Зразумела, давядзецца крыху больш напружыцца, каб выканаць усе заказы. І мы іх, безумоўна, выканаем. Спецыялісты ў нас добрыя, да справы ставяцца адказна. А што датычыць аб'ектаў — восьвось здаём 40-кватэрныя дамы ў Слуцку па вуліцы Жукава і ў Мар'інай Горцы, 12-кватэрны — у вёсцы Камунар Любанскага раёна. Цяпер таксама працуем на 60-кватэрным доме ў Любані, 100-кватэрным — у Слуцку ж, на 40-кватэрным у Мар'інай Горцы і на іншых жыллёвых аб'ектах, а таксама на двух буйных малочнатаварных фермах — у Раманаве і Кляпчанах. Нам таксама трэба будзе замяніць 2600 метраў цепласетак у Любані — гэтая праца разлічана на жнівень. Фінансаванне ўсіх аб'ектаў ідзе адносна нармальна.

— Ваша арганізацыя ўвогуле невялікая і адносіцца да ліку мясцовых будаўнічых арганізацый. А чым адрозніваюцца, так бы мовіць, «вялікія» і «малыя» будаўнікі?

— Я такога падзелу не бачу і не рабіў бы. Добры прафесіяналізм, а таксама належнае, адказнае стаўленне да справы павінны быць як у адных, так і ў другіх. Гэта — галоўнае. Увогуле, патрабаванні да будаўнікоў, да іх працы апошнім часам значна выраслі. І гэтыя патрабаванні — абсалютна аднолькавыя для ўсіх нас. Што датычыць непасрэдна нашай арганізацыі, мы свае спецыфічныя работы можам выканаць на любым аб'екце.

— Якая ў вашай арганізацыі далейшая перспектыва?

— Думаю, што, нягледзячы ні на якія абставіны, работа для будаўнікоў заўсёды знойдзецца, у тым ліку і для нас. Звычайна ж так мяркуюць: разам са спыненнем будаўніцтва ўвогуле спыняецца ўсякае развіццё. А значыць — перспектыва ва ўсіх нас толькі адна: будаваць і развівацца. Мы сёлета, не так даўно, атрымалі яшчэ адну ліцэнзію — на абуладкаванне знешніх газавых сетак. Прадоўжылі таксама сваё тэхнічнае аснашчэнне: набылі новыя, інвектарныя зварачныя апараты, штробарэз (для пракладвання труб у сценах); цяпер праводзім тэндар па набыцці спецыяльнага абсталявання для зварвання поліэтыленавых газавых труб у знешніх газаправодах...

Заўтра мы, як і ўсе будаўнікі краіны, адзначаем прафесійнае свята. Прычым наша арганізацыя будзе адзначаць у жніўні і 35-годдзе з дня яе ўтварэння. Гэта дадае нам аптымізму на перспектыву.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 690019458.

НА ЗДЫМКАХ:
1. Спецыялісты СПМК № 122 брыгадзір Анатоль ГОРЛАЎ, слесар-мантажнік Павел ЛЯХ, электразваршчык Аляксандр САМСОНАЎ, брыгадзір Аляксандр ШЧАРБІЦКІ, электразваршчык Андрэй ГУР.
2. «На гэтым доме нас чакае звычайная работа», — зазначаюць у СПМК № 122.
3. Дырэктар СПМК № 122 Мікалай МІНАКОЎСКІ.
4. Майстар Алена КАТОВІЧ.
5. Майстар Сяргей ЧЭРКАС.
6. Гаспадыня склада мехкалоны Валянціна ШЭЛАП.
7. Вадзіцель СПМК № 122 Канстанцін ЛОБАН.
8. Праараб Аляксей САНЬКО.
9. Спецыяліст па кадрах Ніна САПРАНОЎСКАЯ.
10. Так выглядае фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, на якім шмат папрацавалі спецыялісты СПМК № 122.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ТРЭБА ЗВЯРТАЦЦА ПА ЗАКЛЮЧЭННЕ Ў МАЙСТЭРНЮ, А ПОТЫМ УЖО — У ЭЛЕКТРАСЕТКІ

З аграгарадка Шаршуны Мінскага раёна патэлефанаваў з пытаннем Анатоль Рыгоравіч Стаін. Яшчэ ў ноч на 22 ліпеня над населеным пунктам прайшла навальніца. Яна пацягнула за сабой ланцуг праблем, якія не вырашаны дагэтуль. Па версіі заяўніка, падзеі разгортваліся наступным чынам.

Падчас разгулу стыхіі ў аграгарадку прапала электрычнасць. Наступнай раніцай аднаўляць яе падачу прыехала рамонтная брыгада электрыкаў. Быццам бы яны нешта не тое зрабілі, бо на лінію пайшло напружанне ў 380 вольт. І ў многіх насельнікаў, як сказаў Анатоль Рыгоравіч, пагарэлі электрабытавыя прыборы. У заяўніка, у прыватнасці, «загадалі доўга жыць» халадзільнік, радыётэлефон і магнітафон, а газавы кацёл быў пашкоджаны. Людзі потым тэлефанавалі ў электрасетку, маўляў, як быць з пакрыццём нанесенай людзям шкоды, аднак ад гэтага звароту там быццам бы папросту адмахнуліся. Вось і прасіў Анатоль Рыгоравіч параіць: што ж рабіць яму і іншым далей у такой сітуацыі?

Мы звярнуліся ў Астрашыцкагарадоцкія раённыя электрычныя сеткі і пачулі трохі іншую версію падзей. Так, пацвердзілі нам, падчас навальніцы было адключэнне лініі: на яе ўпала дрэва, і аўтаматыка зрабіла сваю справу. Спецыялісты потым правялі агляд і аднавілі пашкоджанае абсталяванне. Аднак падчас агляду было выяўлена і несанкцыянаванае падключэнне да лініі гаспадарчых пабудоў кшталту хлявоў некалькіх жыхароў. Іх адключылі, аднак праз нейкі час, як высветлілася, асобныя грамадзяне зноў несанкцыянавана далучыліся да лініі электрапередач. Што стала прычынай выхаду са строю электрабытавых прыбораў — сказаць проста вось так немагчыма, зазначылі нам на прадпрыемстве. Магчыма, адыграла сваю ролю згаданае несанкцыянаванае падключэнне? Трэба ведаць, чыёй вытворчасці была тая тэхніка, ці была яна разлічаная на нашы сеткі? Увогуле, зазначылі спецыялісты, у любой інструкцыі па карыстанні электрабытавым прыборам запісана, што падчас навальніцы яго пажадана адключаць. Чаму насельнікі не зрабілі гэтага?

Так, пацвердзілі нам далей: быў адзін тэлефонны зварот наконт магчымага пакрыцця прадпрыемствам панесенага матэрыяльнага ўрону. Аднак ад гэтай просьбы ніхто не адмахваўся. Заяўніку патлумачылі, што любы грамадзянін, які мае нейкія прэтэнзіі, павінен напачатку звярнуцца ў раённыя электрычныя сеткі. У залежнасці ад таго, што будзе ўказана ў тым заключэнні, і будзе прымацца далейшае канчатковае рашэнне па скарзе заяўніка, запэўнілі нас на прадпрыемстве.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дзяржкантроль

Інтарэсы забудоўшчыка і... заробак спецыяліста тэхнагляду

Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці прапанаваў аблвыканкаму ўстанавіць матэрыяльную залежнасць спецыялістаў упраўленняў капітальнага будаўніцтва са скаргамі на недаробкі і дэфекты пасля здачы дамоў.

Толькі за май—чэрвень, калі працавала «гарачая лінія», у Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці паступіла 116 скаргаў на няякаснае выкананне будаўніча-мантажных, аддзелачных, ізаляцыйных работ у шматкватэрных жылых дамах, добраўпарадкавання тэрыторый. Тут і падцёкі, і трэшчыны, і праблемы з вентыляцыяй, інжынернымі сеткамі ... У шэрагу выпадкаў мясцовыя выканаўчыя органы, заказчыкі і падрадныя арганізацыі фармальна ставіліся да законных патрабаванняў грамадзян, зацягваліся тэрміны ўстаранення недаробак і заўваг. Прычым гэта не тыя хібы, што выяўляюцца ў ходзе будаўніцтва і тут жа наводзіцца парадак, а ў дамах, якія ўжо здадзены ў эксплуатацыю, у тым ліку і летась.

Пры гэтым кожны дом ад пачатку і да здачы «вёўся» канкрэтным УКБ і таксама канкрэтным работнікам гэтага ўпраўлення, які ажыццяўляў тэхнічны нагляд. Адпаведна ён атрымаў зарплату, прэмію. Але дзе ж абарона інтарэсаў забудоўшчыкаў, якія, па сутнасці, нанялі гэтага спецыяліста для нагляду за якасцю будаўніцтва? Не выконваеш свае абавязкі — павінен карацца матэрыяльна, лічыць Камітэт дзяржкантролю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Ну і ну!

Гарэў двойчы за некалькі гадзін

Своеасаблівы сумны рэкорд устанавіў непрацуючы мінчанін 1963 года нараджэння: яго ратавалі на пажарах, прычынай якіх быў ён сам з-за курэння ў ложку, двойчы на працягу некалькіх гадзін!

У нумары «Звязды» ад 12 жніўня мы ўжо расказвалі, што ў 4.04 суседзі паведамілі пра пажар ў кватэры на чацвёртым паверсе чатырохпавярховага жылога дома па вуліцы Вадалажскай. З-за курэння ў адным з яе пакояў загарэліся пасцельныя рэчы. Пажар ліквідавалі ў 4.20. Гаспадар не пацярпеў, толькі надыхаўся дыму, таму пасля агляду медыкамі ад шпіталізацыі адмовіўся. Аднак на гэтым усё не скончылася.

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, праз тры гадзіны выратавальнікі зноў мусілі ехаць у гэтую ж кватэру па выкліку. На гэты раз у пакоі загарэлася крэсла. Гаспадару падчас другога ўзгарання не пашчасціла: мужчына з тэрмічнымі апёкамі галавы, кісцей рук (першай-другой ступені), тэрмаінгаляцыйнай траўмай, атручэннем прадуктамі гарэння быў шпіталізаваны. Прычына пажару неарыгінальная: неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні ў нецвярозым стане.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ёсць нагода. Ёсць пытанне

АДНОЙ ЛЕВАЙ!

Якой рукой вы пішаце, трымаеце відэлец ці лыжку? Калі правай, то ваша шчасце: рэчаіснасць створана менавіта для вас. Калі левай, то вам даводзіцца прыстасоўвацца. Але ж сёння, 13 жніўня, ваш дзень! Упершыню Міжнародны дзень леварукіх адзначылі ў 1992 годзе па ініцыятыве брытанскага Клуба леўшуноў.

У гэты дзень леўшуны ўсяго свету імкнуцца неяк прыцягнуць увагу вытворцаў розных тавараў да неабходнасці ўлічваць інтарэсы і леварукіх людзей. Аднак галоўная праблема леўшуноў — гэта жаданне іншых людзей (настаўнікаў у школах, бацькоў) іх перавучыць. Але навошта гэта рабіць? Леўшуны — гэта людзі з моцным характарам і вялікім творчым патэнцыялам. Іх «перароб ка» можа мець псіхалагічныя наступствы.

Дарэчы, прыкладна 10% насельніцтва Зямлі — леўшуны. У свой час сярод гэтых дзесяці працэнтаў было шмат славутых людзей: Юлій Цэзар, Аляксандр Македонскі, Карл Вялікі, Жанна Д'Арк, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Бетховен, Напалеон, Марк Твэн і шмат іншых.

ДАВАЙЦЕ СПЫТАЕМ У ЛЕВАРУКІХ, ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ ЛЕЎШУНОМ?

Максім СТАЯН, студэнт Інстытута журналістыкі БДУ, пазаштатнік «Звязды»:

— Па вялікім рахунку, я не адчуваю сябе нейкім недасканалым сярод праварукіх. Мне гэта зусім не перашкаджае ў жыцці. Леўшуны больш схільныя да творчых прафесій, чым праварукія людзі. Да таго ж мне пашчасціла, што мяне ніколі не імкнуліся перавучыць. Ды і з боку аднагодак не было ніякіх папрокаў ці кпінаў.

Галіна ЧАРАНКОВА, студэнтка эканамічнага факультэта БДУ:

— Я ў дзяцінстве была леўшуном. Мяне дзядуля перад школай вырашыў перавучыць, а ў дзіцячым садку я была цалкам леверукай. Ён сказаў, што быць леўшуном — гэта не пасавецку. Мяне прымушалі, седзячы за сталом, трымаць левую руку пад нагою. Так мяне прывучвалі да таго, каб я рабіла ўсё толькі правай рукой: і пісала, і ела. Зараз я ўжо левай рукой валодаю горш, чым правай. Але, калі не задумваюся, то працягнутую мне рэч я вазьму левай рукой.

Ганна МАРОЗАВА, студэнтка БНТУ:

— Мне вельмі весела быць леўшуном. Увесь час шукаю ў сабе якія-небудзь таленты. Я ж нарадзілася леверукай, і бацькі вырашылі, што перавучваць не будуць: раз так нарадзілася, значыць, так трэба. Цяжкасці, зразумела, бываюць. Напрыклад, вельмі нязручна нажніцамі карыстацца. Кіраваць машынай таксама нязручна: педалі «газу» і «тормазу» блытаю.

Антон ВЕРАМЕЙЧЫК, студэнт Жодзінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа:

— Я ляўшун з нараджэння. Перавучваць не сталі. Нейкіх праблем асаблівых няма. Вось толькі давялося прыстасоўвацца да камп'ютэрнай клавіятуры. А так вельмі многае я магу рабіць і левай, і правай рукой. Чуў, што леўшуны больш творчыя, але нават не ведаю, ці адносіцца гэта да мяне. Быў час, калі вершы пісаў. Ды так проста бывае нейкія цікавыя думкі ў галаву прыходзяць.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Ну і ну!

«Нудыстаў» затрымалі

Чацвёра мужчын, якія жывуць у мікрараёне Паўночны, што ў Баранавічах, прайшлі голымі ад возера Свяцілаўскага да Лядовага палаца. А дзве жанчыны з іх адзеннем ішлі следам. Нехта з мінакоў патэлефанаваў у міліцыю, і «нудыстаў» затрымалі.

Выявілася, што ўсе яны раней былі судзімыя. Напачатку «нудысты» растлумачылі, што зрабілі гэта, выконваючы ўмовы закладу, а затым заявілі, што былі п'яныя і нічога не памятаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Абрабаваў пенсіянерку

У пад'ездзе дома па вуліцы Набярэжнай у Брэсце каля васьмі вечара на 84-гадовую бабулю напаў зламыснік і адабраў пакет з прадуктамі і кашальком. У кашальку пенсіянеркі ляжала 2 130 000 рублёў. Па гарачых слядах міліцыя затрымала рабаўніка.

Яна СВЕТАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона — Новомышский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена земельного участка, рублей	Сумма задатка, рублей	Затраты на организацию и проведение аукциона, рублей
1.	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Боровцы, ул. Озерная, д. 12 120486000601000107	Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети	0,1171 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	5 354 280	535 430	Стоимость за: формирование земельного участка 1022759 руб.; государственную регистрацию создания земельного участка 70 000 руб., информационные сообщения в средствах массовой информации — газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ
2.	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Боровцы, ул. Озерная, д. 14 120486000601000106	Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети	0,1005 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	4 595 260	459 530	Стоимость за: формирование земельного участка 993085 руб.; государственную регистрацию создания земельного участка 70 000 руб., информационные сообщения в средствах массовой информации — газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ

1. Аукцион состоится **15 сентября 2011 года в 15.00** в здании Новомышского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

2. Условия аукциона:

- к участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в соответствии с действующим законодательством.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 11 сентября 2011 г. до 13.00 на р/счет 3600211140009 в ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код платежа 4901, УНП 200047005.

Адрес банка: г. Барановичи, Б. Штоккерау, 8А.

Получатель: Новомышский сельский Совет депутатов, 225331, Брестская обл., Барановичский р-н, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Результаты аукциона утверждаются решением комиссии по проведению аукциона.

В случае наличия одной заявки предмет аукциона может быть продан по начальной цене с учетом шага аукциона по решению комиссии.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефону (8 0163) 43 12 36.

8. Продажа земельного участка производится без изменения его целевого назначения.

9. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 в Новомышском сельисполкоме. Последний день приема документов 11 сентября 2011 г. до 13.00. Заключительная регистрация участников аукциона **15 сентября 2011 г. с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

10. Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации зем. участка и затраты на подготовку и проведение аукциона (в том числе затраты, связанные с размещением извещений о проведении аукциона в средствах массовой информации); внести плату за земельный участок. Не позднее 2-х месяцев после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 29.08.2011 открытого аукциона по продаже конфискованного имущества

Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Пятикомнатная квартира № 10, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Грибоедова А.С., д. 2 (расположена на 6-м этаже, общая площадь 202,1 кв.м, инв. номер 500/D-624383)
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 227 48 36
Начальная цена	736 222 770 белорусских рублей
Сумма задатка	73 000 000 белорусских рублей
Обременения	Наличие зарегистрированных в квартире физических лиц

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **29 августа 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.08.2011 по 25.08.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36;
сайт: www.mgcn.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ДЯТЛОВСКОМ РАЙОНЕ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ

Дата, время, место проведения аукциона	Аукцион состоится 15 сентября 2011 года в 11.00 по адресу: г. Дятлово, ул. Красноармейская, 3 в зале заседаний			
	Организатор аукциона — Дятловский районный исполнительный комитет			
Номер лота	**1**	**2**	**3**	**4**
Адрес земельного участка	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Ленина, 39а	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Октябрьская, 1	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Ленина, 26Б	Гродненская область, Дятловский район, г. Дятлово, ул. Октябрьская, 100Б
Кадастровый номер	422356300002000624	422356300002000348	422356300002000564	422350100002001052
Площадь участка, га	0,0034	0,0050	0,0050	0,0099
Целевое назначение	установка торгового павильона	установка торгового павильона	установка торгового павильона	установка торгового павильона
Срок аренды	2 года	5 лет	5 лет	10 лет
Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	возможность подключения централизованного водоснабжения, водоотведения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения
Начальная цена предмета аукциона (руб.)	115377	183467	147441	513782
Сумма задатка (руб.)	11000	18000	14000	51000
Затраты на организацию и проведение аукциона (без учета расходов по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ), (руб.)	84000	590671	600621	1556907
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; заключение победителем аукциона с Дятловским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией			

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка, задатков на расчетный счет 3602515000056 в филиале № 413 АСБ «Беларусбанк» г. Лида, ЦБУ 407, код 696, УНП 500049290, код платежа 4002, назначение платежа — внесение задатка на аукцион, получатель платежа — финансовый отдел Дятловского районного исполнительного комитета.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем — копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами продажи в рабочее время по согласованию с аукционной комиссией.

Заявления на участие в аукционе принимаются **по 12 сентября 2011 г. включительно** по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, 20, землеустроительная служба Дятловского райисполкома в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Телефоны для справок: 8 01563 21778, 8 01563 24041.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников в отношении предмета аукциона.

Регистрация участников аукциона будет производиться **15 сентября 2011 г.** с 8.00 до 10.50 по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, 20, землеустроительная служба Дятловского райисполкома.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИЕ, ОПУБЛИКОВАННОЕ В ГАЗЕТЕ «ЗВЯЗДА» от 06.08.2011:

1. Начальная цена продажи предмета торгов, реализуемого с повторных открытых аукционных торгов 16 августа 2011 г. в 15.00, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйскагромаш» (продавец)

СОСТАВЛЯЕТ:

по Лоту № 1 – 364 950 000 рублей без учета НДС, по Лоту № 2 – 586 568 598 рублей без учета НДС.

2. Условия продажи: Победитель (Претендент на покупку) возмещает НДС по ставке 20% от цены продажи предмета торгов.

Остальная информация остается без изменений.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 86 96, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30

ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 9, Г. ВИТЕБСК»

извещает своих акционеров о проведении 26 августа 2011 года внеочередного общего собрания акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об увеличении уставного фонда Общества.

2. Об утверждении решения о выпуске акций Общества.

3. О внесении изменений в устав Общества.

Собрание состоится в 15.00 в здании ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск», по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 5.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по состоянию реестра на 15 августа 2011 г.

Регистрация акционеров проводится с 14.30 до 15.00.

Акционерам при себе иметь паспорт, представителям — доверенность.

Справки по телефону (8 0212) 37 28 93.

С материалами собрания можно ознакомиться с 17 августа 2011 года в общем отделе ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 5.

Наблюдательный совет.

УНП 300029266

Минский районный исполнительный комитет 15 сентября 2011 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Закаблуки	623681305601000172	0,1484 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 313 148	52 000 000	5 200 000
2	Горанский с/с, д. Тресковщина	623681318101000160	0,1607 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 415 978	31 000 000	3 100 000
3	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 59	623683403601000181	0,1469 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 584 000	19 000 000	1 900 000
4	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 60	623683403601000182	0,1473 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 584 000	19 000 000	1 900 000
5	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 61	623683403601000183	0,1466 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 584 000	19 000 000	1 900 000
6	Самохваловичский с/с, д. Василевщина	623686301601000067	0,1240 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 529 000	16 000 000	1 600 000
7	Самохваловичский с/с, д. Курковичи	623686302101000097	0,1220 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 529 000	16 000 000	1 600 000
8	Самохваловичский с/с, д. Русиновичи	623686303101000163	0,1378 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 529 000	16 000 000	1 600 000
9	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 88	623687508101001043	0,1419 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	24 000 000	2 400 000
10	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 90	623687508101001022	0,1371 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	23 000 000	2 300 000
11	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 257	623687508101001135	0,1498 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	25 000 000	2 500 000
12	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 283	623687508101000898	0,1462 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	24 000 000	2 400 000
13	Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 110	623687507101000404	0,1498 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	23 000 000	2 300 000
14	Юзуфовский с/с, д. Буцевичи	623688201101000191	0,2376 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 194 404	18 000 000	1 800 000
15	Юзуфовский с/с, д. Буцевичи	623688201101000192	0,1865 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 085 207	14 000 000	1 400 000
16	Юзуфовский с/с, д. Гатовино	623688202101000072	0,2199 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 114 077	21 000 000	2 100 000
17	Юзуфовский с/с, д. Сады	623688207101000006	0,2000 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	182 000	15 000 000	1 500 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **15.09.2011 г. в 9.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **09.09.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3–5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На Лоты 6–8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лоты 9–13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На Лоты 14–17 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

З ГОРШАГА Ў ЛЕПШАЕ

Кватэрнае пытанне

Мы з жонкай і дзіцем займаем адзін пакой у інтэрнаце для маласямейных. Будынак яго ўжо досыць стары і, як на наш погляд, не адпавядае ніякім санітарным і тэхнічным патрабаванням... Калі ён усё ж пойдзе пад знос, якое жыллё нам павінны даць узамен?

А. ЛЫКАЎ, *г. Бабруйск.*

Згодна з п. 59 Палажэння аб інтэрнатах (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 1999 г. № 1437, у рэдакцыі пастановы ад 14 снежня 2005 г. № 1441) у выпадку зносу жылога дома, у якім размешчаны інтэрнат, або пераабсталявання гэтага жылога дома ў нежылы, а таксама, калі жылы дом (жылое памяшканне) пагражае абвалам, грамадзянам, якія пражываюць у ім, выдзяляецца іншая жылая плошча ў інтэрнаце.

Пры немагчымасці выдзялення жылой плошчы ў інтэрнаце названым грамадзянам, за выключэннем сезонных, часовых работнікаў і грамадзян, якія працуюць (праходзяць службу) па тэрміновым працоўным дагаворы, а таксама грамадзян, якія пасяліліся ў сувязі з навучаннем, выдзяляецца іншае жылое памяшканне.

Іншае жылое памяшканне, якое выдзяляецца грамадзянам у сувязі з высяленнем з інтэрната, павінна адпавядаць вызначаным санітарным і тэхнічным патрабаванням і знаходзіцца ў рысе гэтага населенага пункта.

Віктар САВІЦКІ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Стральцам важна не перастарацца з ціскам на навакольных, а Дзевам не варта імкнуцца вырашыць усе праблемы зараз

ВАЕН. Многае будзе атрымлівацца, асабліва калі сумяшчаць прыемнае з карысным. Магчыма ўзнікненне вострых і непрадказальных сітуацый. Таму важна хутка і ўпэўнена прымаць рашэнні. Дзякуючы таварыскасці і дыпламатычнасці вы здолееце наладзіць сувязі з дзелавымі партнёрамі. Асцярожней і ўважлівей пастаўцеся да дакументаў, бо верагодныя прыкрыя памылкі пры іх складанні.

ЦЯЛЕЦ. Пажадана сачыць за сваімі выказваннямі. Вам можа спатрэбіцца дапамога сяброў, бо будзе складана справіцца з вялікім аб'ёмам працы. У сераду верагодныя добрыя навіны, звязаныя з перспектыўнымі прапановамі. У сярэдзіне тыдня не выключана пераразмеркаванне абавязкаў у працоўным калектыве, у выніку чаго асабіста вы можаце атрымаць большую самастойнасць.

БЛІЗНЯТЫ. Неабходна разумна падысці да вырашэння сітуацыі, якая склалася. Памятайце, што цяпер эмоцыі будуць толькі перашкаджаць вам. Планы на працы могуць змяніцца з дакладнасцю да наадварот, толькі не палохайцеся, вы цудоўна справіцеся з усімі зменамі. Накіруйце сваю энергію на рашэнне самай актуальнай на гэты момант справы.

РАК. Тыдзень звязаны з удалымі паездкамі, асабліва ў панядзелак і нядзелю, прычым гэта датычыцца і самых кароткіх, і далёкіх. На працы праявіце прадбачлівасць — хай пра вашы поспехі пакуль не ведаюць калегі, бо іх дасведчанасць можа стварыць вам пэўную праблему. Верагодныя неспадзяваныя змены ў планах, раптоўныя сустрэчы і перамовы, спрыяльныя стабілізацыі фінансавых рэсурсаў.

ЛЕЎ. Спрыяльны час для рэалізацыі творчых задум. Многія пытанні можна вырашыць, не сустракаючы на сваім шляху асабліва перашкод. Паспрабуйце не прымаць удзел у інтрыгах, бо можаце трапіць на сваю ж вуду. Падумайце пра будучыню, стварыце падмурак для рэалізацыі сваіх планаў. Надайце адмысловую ўвагу дзелавым партнёрам.

ДЗЕВА. Не імкніцеся вырашыць усе праблемы зараз, не будуйце грандыёзных планаў і не прыступайце да іх ажыццяўлення — нічога не атрымаецца, вы толькі змарнуеце свае сілы і будзеце дарма турбаваць навакольных, якіх можаце ўцягнуць у арбіту сваёй бурнай, але, на жаль, бескарыснай дзейнасці. Замест гэтага дакладна расплануйце сваю дзейнасць у гэтыя дні, вылучыце галоўнае і займіцеся гэтай і толькі гэтай справай.

ШАЛІ. Вам цяпер давядзецца шмат працаваць, таму лепш не распыляцца на дробязі: вазьміцеся за адну справу і зрабіце яе якасна. Поспех могуць прынесці новыя ідэі і кантакты, але пры гэтым паспрабуйце пазбягаць непатрэбных, пустых сустрэч. Пажадана быць як мага больш непрыкметнымі і сціплымі ў вачах начальства, асабліва ў першай палове тыдня. Праверце надзейнасць новых партнёраў — толькі тады ёсць сэнс пачынаць сур'ёзную сумесную дзейнасць.

СКАРПІЁН. Вам проста неабходна захоўваць паслядоўнасць у дзеяннях. У пачатку тыдня варта прымаць або, прынамсі, абдумваць новыя прапановы — асабліва калі яны пачнуць паступаць у нарастаючым тэмпе. Усё вакол будзе несці карысную інфармацыю. У чацвер лепш не падпісваць ніякіх папер без крайняй неабходнасці, а калі вам усё ж такі давядзецца гэта рабіць, правярайце кожную літару і лічбу вельмі ўважліва.

СТРАЛЕЦ. Давядзецца праявіць гнуткасць розуму і максімум кемлівасці. Паглядзіце па-філасофску на сітуацыю, якая склалася, не перастарайцеся з ціскам на навакольных, ну а па дробязях можна і саступіць. Дбайна правярайце важную інфармацыю, якая паступіць да вас на гэтым тыдні, бо магчымыя падвохі і недакладнасці. Пажадана не дапускаць спрэчак і канфліктаў, таму што яны будуць каштаваць занадта дорага.

КАЗЯРОГ. На першы план могуць выйсці праблемы кар'еры. Вам неабходна не распыляцца па дробязях, а, вызначыўшы сабе выразныя і пэўныя мэты, упэўнена прасоўвацца да іх дасягнення. Не ўзвальвайце на сябе чужыя клопаты і праблемы, інакш не справіцеся з пастаўленымі задачамі. У аўторак новыя акалічнасці могуць прымусіць вас перарабляць ужо гатовую працу. Вы можаце разлічваць толькі на ўласныя сілы. А ў пятніцу праца ў адзіноце прынясе больш плённыя вынікі.

ВАДАЛЕЙ. Выявяцца вашы рознабаковыя таленты, аднолькава добра будуць атрымлівацца як бытавыя, так і прафесійныя справы. Паспрабуйце не грэбаваць некаторымі ўмоўнасцямі і праявіце рашучасць у пераадоленні цяжкасцяў. Па меры сіл пацешце сваіх блізкіх — адчуванне свята будзе спрыяць добраму настрою.

РЫБЫ. Хай ваша сціпласць абмяжуецца тым, што вы не будзеце занадта шмат расказваць пра свае дасягненні. Вазьміце на сябе абавязак прыняць хоць бы пару невялікіх самастойных рашэнняў, як бы цяжка ні было рызыкнуць узяць на сябе адказнасць. Верце сваім пачуццям: не так важны вынік, як сама ваша рашучасць.

Запрашальнік

Залатая пчала — знак багацця

Клімавіцкі раён запрашае ў госці ў нядзелю, 14 жніўня. У вёсцы Стары Дзедзін, на беразе ракі Асцёр, пройдзе свята, прысвечанае 230-годдзю герба Клімавічаў з выявай залатой пчалы.

На свяце адбудзецца хрэсны ход з асвячэннем вядомай крыніцы «Бяздонны калодзеж», асвячэнне і продаж мёду, канцэрт з удзелам клімавіцкіх артыстаў і гасцей з памежнай Смаленскай вобласці.

У Старым Дзедзіне ў час свята будуць працаваць сельскія падворкі, арганізаваны гандаль — у прыватнасці, жывой рыбай, пройдзе конкурс на лепшы выраб з макам і мёдам. Будзе цікава і смачна!

Ілона ІВАНОВА.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

15 жніўня — галоўны ўрач мінскага гарадскога радзільнага дома № 2 Наталля Алегаўна КУРЭК.

16 жніўня — галоўны ўрач Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Андрэй Пятровіч МІЦЬКО.

17 жніўня — намеснік дырэктара па вытворчасці РНПЦ гематалогіі і трансфузіялогіі Лявонцій Рыгоравіч ЛАГОДЗІЧ.

18 жніўня — намеснік дырэктара РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Рышард Рамуальдавіч СІДАРОВІЧ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (222 20 25)

15 жніўня — загадчык кардыялагічнага цэнтра Мінскай абласной клінічнай бальніцы Генадзь Іванавіч КАСЦЕВІЧ.

16 жніўня — загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Мінскага абласнога радзільнага дома Ігар Леанідавіч КАДЛУБОВІЧ.

17 жніўня — загадчык філіяла № 1 «Атолінская бальніца» Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Мікалай Рыгоравіч ГРЫШУК.

18 жніўня — загадчык другога туберкулёзнага (лёгачнага) аддзялення Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Наталля Анатольеўна ВОРАНАВА.

19 жніўня — загадчык лячэбнага стаматалагічнага аддзялення Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Людміла Ананьеўна КОБРЫНА.

У графіку магчымы змяненні.

Памежжа

У СУВЯЗІ З РЭКАНСТРУКЦЫЯЙ

Камандаванне Лідскага памежнага атрада інфармуе, што ў сувязі з правядзеннем работ па рэканструкцыі ў пункце пропуску «Каменны Лог» — «Мядзінінкай», па ўзгадненні з літоўскім бокам у перыяд з 16 па 23 жніўня будзе ажыццяўляцца пропуск грамадзян праз дзяржаўную мяжу ў пункце спрошчанага пропуску «Доцішкі» — «Эйшышкес» Радуньскага сельсавета Воранаўскага раёна па зменены рэжыме.

У гэты перыяд пункт спрошчанага пропуску «Доцішкі» будзе працаваць кругласутачна. Пропуск будзе ажыццяўляцца пры наяўнасці сапраўдных дакументаў на права перасячэння мяжы (у тым ліку візаў Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі адпаведна для замежных і беларускіх грамадзян). Пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы трэба абавязкова мець медыцынскі страхавы поліс і міжнародны поліс грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Гэтыя транспартныя сродкі павінны належаць асобам, якія едуць на іх, на праве ўласнасці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КАЛІНА-МАЛІНА

Бяседныя песні

Фальклорны вобраз «каліна-маліна» прасвятляе змест аднайменнай песні. Каліна — вольналюбная расліна, прыгожая на выгляд — пышназялёная, квяцістая, з чырванню ягадных гронак увосень. Колькі даводзіцца ёй вытрымаць, каб у непагадзь, у спякоту зберагчы сваё харастно і прыўкрасіць ім навакольле. Лекавая сакавітасць каліны ўзмацняецца і спажываецца пасля першых замаразкаў, а маліна якраз страчвае сваю спакуслівую духмянасць пасля іх. Як у прыродзе ўсё ўзаемазвязана!

І каліна, і маліна атаясамліваюцца з абліччам і сутнасцю жанчыны. Выраз «каліна-маліна» нагадвае пра драматызм яе існавання, пра супярэчлівасць стасункаў і іх напружанае перапляценне і вырашэнне. Змест песні перадае тыповае разгортванне сямейных падзей, дзе любоў і каханне патанаюць у надзённых клопатах і турботах. І толькі яе мелодыя супакойвае і прасвятляе...

Гэтай песняй сябры і калегі віншуюць вядомага пісьменніка Віктара Гардзея з днём народзінаў, які адзначаецца на наступным тыдні. У вершаваных і празаічных творах ён тонка перадае душэўны стан чалавека, па-фальклорнаму мудра выяўляе яго духоўнае яднанне з навакольнай прасторай. Згадаем толькі па-філасофску разважлівыя радкі з верша «Калінавы мост»:

Зноў каліна цвіце, і з надрывам
Хтосьці плача ў зялёных лугах,
Дзе калінавы мост над абрывам
На іржавых рыпіць ланцугах.

Акварэльна яркімі фарбамі створаны сімвалічна-вобразны малюнак, які выклікае глыбокі роздум над нашым быццём і эмацыйна-духоўнай напоўненасцю пераклікаецца з песняй «Каліна-маліна».

КАЛІНА-МАЛІНА

Беларуская народная песня



Каліна-маліна
*Над вірам стаяла.**
Маці сваю дачку
Праз год не пазнала.
— Ці на цябе, дочка,
Тры журбы напала?
— Ой, першая журба —
Дзяціна малая.
Ой, другая журба —
Свякроўка ліхая.
А трэцяя журба —
Мілы не кахае.

Сам ён едзе ў поле —
Полюшка араці,
Ды бярэ ён мяне
Валы паганяці.
Я правай рукою
Валы паганяю,
Леваю рукою
Слёзы выціраю.

* Кожнае двухрадкоўе паўтараецца.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

У **суд Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобл.** паступіла заява аб прызнанні памерлым **Шыбко Аляксандра Валер'евіча**, 11 сакавіка 1974 года нараджэння, ураджэнца в. Быцень Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства: в. Быцень, вул. Чкалава, 33 Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобл.

Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Шыбко Аляксандра Валер'евіча, паведаміць іх суду Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобл. на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

СЁННЯ мы з вамі, дарагія кулінары, праверым на практыцы прымаўку «кашу маслам не сапсуеш». Давайце паспрабуем са звычайнага гарніру зрабіць што-небудзь «гэткае». Паспрабавала выбраць найбольш незвычайныя і разам з тым простыя рэцэпты. Спадзяюся, вам спадабаецца.

Прасяная каша з карамельнымі яблыкамі

Дабаўленне кіславатых яблыкаў ператварае звычайную прасяную кашу ў арыгінальную страву.

Цукар, расплаўлены ў сметанковым масле, надае кашы фантастычна смачны водар.

Вазьміце: *300 г проса, 3 яблыкі (400—500 г), 40 г сметанковага масла, 1/3 шклянкі цукру, 1 л малака або 10-20-працэнтных вяршкоў (яблыкі ўзяць цвёрдыя, кіслыя або кісла-салодкія).*

Яблыкі ачысціць ад лупіны і насення. Парэзаць кубікамі. У патэльні на вялікім агні растапіць масла. Роўным слоем насыпаць цукар. Пачакаць, калі цукар у некалькіх месцах пачне карамелізавацца (рудзець). Не даводзіць да вельмі моцнага пацямнення цукру, інакш у кашы будзе гаркаваты прысмак. У патэльню насыпаць яблыкі і перамяшаць. Карамель можа застыць цвёрдымі камячкамі, але гэта не страшна, таму што яна потым часткова разыдзецца ў яблычным соку, а часткова — у малацэ пры варцы кашы. Патушыць яблыкі прыкладна 2—3 хвіліны. Проса добра прамыць і засыпаць у гаршчок. Зверху выкласці яблыкі разам з сокам, які выдзеліўся з іх. Заліць малаком або вяршкамі. Увага! Калі малако нятлустае або не вельмі свежае, то вялікая верагоднасць таго, што яно скісне з-за кіслаты яблыкаў. У далейшым гэта ў кашы будзе непрыкметна і на смак не паўплывае. Але чым больш тлустым будзе малако або вяршкі, тым у іх меншая верагоднасць скіснуць. Гаршчок, не накрываючы, паставіць у халодную духоўку. Тэмпературу выставіць на 220 °С. Таміць кашу 1 гадзіну, затым духоўку выключыць, накрыць гаршчок накрыўкай і пакінуць у духоўцы яшчэ на 20 хвілін. Пры падачы кашу можна пасыпаць парэзанымі арэхамі.

Рыс з перцам і арахісам

Нам спатрэбіцца: *1 шклянка рысу, 1 цыбуліна, 3 зубкі часнаку, 2 салодкія балгарскія перцы (1 зялёны, 1 чырвоны — для прыгажосці), 1 жменя нясмажанага арахісу.*

Рыс адварыць. Абсмажыць дробна парэзаную цыбулю да празрыстасці. Дадаць перац, парэзаны да памеру арахісу, дробна парэзаны часнок, арахіс. Накрыць накрыўкай. Тушыць 20—25 хвілін. Дадаць рыс. Перамяшаць. Выключыць агонь і даць страве пастаяць.

Каша кукурузная з журавінамі

Вазьміце: *1 шклянку кукурузных круп, 3 шклянкі вады, 1/2 шклянкі разынак, 1 сталовую лыжку сметанковага масла, 1/2 шклянкі журавін (працёртых з цукрам), соль, цукар — на смак.*

Кукурузныя крупы заліваюць халоднай вадой, вараць, увесь час памешваючы, дадаюць разынкі, соль, цукар — на смак. Падаючы на стол, паліваюць журавінамі, працёртымі з цукрам. Гэтую кашу можна падаваць у халодным выглядзе, папярэдне расклаўшы ў формачкі. Пасля таго, як каша астыне, выкласці з формачак у сподачак.

Аўсяная каша з яблыкамі і карыцай

Для прыгатавання 4 порцый: *злучыць у каструлі 150 г аўсяных шматкоў хуткага прыгатавання з 400 мл яблычнага соку, 400 мл малака і 50 г карычневага цукру.* Давесці да кіпення і варыць 5—6 хвілін, перыядычна памешваючы. Дадаць 1/2 ч. лыжкі карыцы, 70 мл вяршкоў, 50 г разынак і 2 дзёртыя яблыкі (1 зялёнае і 1 чырвонае). Адразу ж падаваць, упрыгожыўшы парэзаным яблыкам.

Каша па-віцебску

Нам спатрэбіцца: *8 бульбін, 1 шклянка круп (ячных, проса, рысу, грэчкі), 1,5 шклянкі малака, 2 сталовыя лыжкі сметанковага масла.*

Бульбу адварыць, працерці, развесці цёплым малаком. У прыгатаваную масу дадаць прамытыя крупы, змяшаць і паставіць у духоўку на 30—40 хвілін. Перад падачай паліць маслам.

ЯДОМЫ АНЕКДОТ

Амаль праўдзівыя запіскі гаспадыні

Ведаю я адну просценькую салату з вяндлінай. А тут яраз вяндліна засталася, ніхто не есць. Дай, думаю, зраблю для разнастайнасці. У салату ідуць ананасы. Адкрыла бляшанку, дастала ананасы — застаўся сок. Піць не хочацца, выліваць шкада.

Ведаю я адзін кексік, у яго сок па рэцэпце дадаюць — ананасавы або апельсінавы. Замяшала кексік, у яго чамусьці з яек толькі жаўткі кладуць. Бялкі засталіся. Выкінуць шкада, захоўваць — усё роўна ў рэшце рэшт выкіну.

Падумала — можна безэ зрабіць? Нічога складанага. У безэ лімонную лупіну надзерла. Застаўся лысы лімон. Калі яго адразу ж не спажыць — засохне! Ну, лімон — гэта проста. Падліўка цудоўная атрымліваецца для салаты.

У салату нарэзала палову цыбуліны. Толькі вялікія цыбуліны ў доме! Астатняя палова — што з ёй рабіць? Вырашыла таматную падліўку для спагеці пасмажыць, больш смажыць з цыбуляй не было чаго. Адкрыла слоік таматнай пасты, спажыла палову. А другую палову куды? Забудуся ж у халадзільніку, а яна без кансервантаў, прападзе. Вырашыла зварыць бацвінне. Для бацвіння не знайшлося капусты.

Прыйшлося паехаць у краму. У краме купіла капусту, моркву, селядца, сасіскі, каўбасу, сурвэткі, пральны парашок, соль, абрус (па зніжцы) і тапачкі (таксама па зніжцы).

Па дарозе з крамы заехала ў банк — заплаціла крэдыт, побач фотаатэлье — заскочыла, забрала фотаздымкі. Забрала штаны з майстэрні, купіла ў булачнай булачкі дзецям для сняданкаў. Ледзь давалакла ўсё гэта ад машыны да ліфта.

Зварыла бацвінне і ўжо не заўважыла, ці засталося штосьці. Села на канапу, уключыла тэлевізар.

Дурніца! Трэба было выліць гэты кляты сок!

Раней яна часта падпарадкоўвалася настрою. І імгненным парывам. З цягам часу на гэту яе асаблівасць наслаілася шмат чаго іншага, але жаданне хоць зрэдку прыслухоўвацца да свайго сэрца і рабіць нешта, з пункту гледжання цвярозага розуму, бязглуздае, не знікла.

Дзякуючы чарговаму такому парыву яна апынулася ў горадзе свайго юнацтва. Проста прачнулася аднойчы раніцай, рассунула шторы, адкрыла акно, усміхнулася сонцу, паслухала, як нетаропка перагаворваюцца на ніжняй лоджыі муж з жонкай, паназірала, як старанна працірае дзверкі сваёй машыны сусед... Выпіла кавы, дастала з антрэсоляў «паходныя» красоўкі, сабрала валасы ў «хвосцік», закінула за плячо сумку і паехала на вакзал.

У касе яна ўзяла білет на хуткасны аўтобус і праз дзве гадзіны язды выйшла на знаёмай станцыі. Не тое каб яна тут даўно не была. Была. Або праездам, або ў камандзіроўцы, калі галава забіта справамі, калі трэба трымаць сябе «ў рамках», адпавядаць «статусу», быць навідавоку, знаёміцца, ветліва ўсміхацца, адказваць на пытанні, рабіць заўвагі і г.д. і да т.п. У такія моманты нельга расслабляцца, нават ненадоўга, а значыць, не варта прыадчыняць дзверцы ў мінулае і ўпадаць у настальгічны транс. Эмоцыі — перашкода працы. У яе выпадку, калі ад кожнай такой сустрэчы залежыць заробак амаль сотні падначаленых, пра гэта трэба заўсёды памятаць.

Спантанная паездка, калі ты ні ад каго не залежыш, калі не трэба вытрымліваць паўзу і рабіць разумны твар, калі ты ёсць ты, — гэта зусім, зусім іншае. І не хочацца ні ад каго хавацца, бо ўсё роўна ніхто не пазнае цябе ў гэтых джынсах і блакітнай маечцы, у зацемненых сонечных акулярах, з «хвастом», перахопленым звычайнай гумкай, і простай палатнянай сумкай, закінутай за плячо... І можна некалькі гадзін блукаць па знаёмых вуліцах, заглядваць у чужыя вокны, заходзіць у крамы, прымяраць непатрэбныя рэчы, есці марожанае ў «брыкеціку», злізваючы яго з пальцаў, чытаць аб'явы на слупах, усміхацца незнаёмым прахожым і ўдыхаць, удыхаць, удыхаць гэтае паветра, усмоктваць яго кожным міліметрам скуры...

— Танюха... Танечка, няўжо ты?..

Ад нечаканасці яна рэзка спыняецца і паварочваецца ў бок лавачак, якія стаяць уздоўж асфальтаванай дарожкі ў скверыку. Пакольki на дарожцы больш нікога няма, звярталіся, трэба думаць, да яе. Але хто?

З лавачкі паднімаецца мужчына, махае ёй рукой, разгублена ўсміхаецца... Караткаватыя, з сівізной, валасы, зачасаныя назад, худы, моцна абветраны, няголены твар, пакамечаная, не першай свежасці кашуля навыпуск, спартыўныя штаны з расцягнутымі «каленкамі», летнія туфлі на босую нагу... Гэта ён паклікаў яе па імені. Памыліўся? Ці мала на свеце Тань-Танюх, а ў такога, напэўна, іх цэлы гарэм, ад яго ж за вярсту патыхае перагарам і танным прытонам.

— Не пазнаеш, Танечка? Гэта ж я, Толік, мы жылі па суседстве. А вось мой «фірменны» знак! — ён паварочвае галаву і дакранаецца да сваёй шчакі.

Яна заўважае на шчацэ рубец і цёмна-карычневую пляму.

Не можа быць... Сапраўды Толя. Якая сустрэча! У сэнсе, якая дзіўная сустрэча. Адкуль ён мог ведаць? Не, зразумела, не мог. Гэта выпадковасць... Як я рады цябе бачыць! Шыкоўна выглядаеш, зусім не змянілася. А чым займаешся?.. Ды так, кірую невялікім прадпрыемствам, цяпер вось у адпачынку, пацягнула да родных мясцін... А хіба ў цябе, Танечка, нехта тут застаўся?.. Не, не засталося, я сама па сабе, проста гуляю, дыхаю, адпачываю... Цудоўна выглядаеш, Таня... Затое пра цябе гэтага не скажаш!

Ён сеў на лавачку і матнуў галавой у знак згоды:

— Сапраўды не скажаш. Я ўжо дзве ночы дома не начаваў. Жонка з цешчай, напэўна, з ног збіліся, шукаючы мяне па знаёмых. А я тут, на самым бачным месцы, ды яшчэ з табой! Што яшчэ трэба для шчасця?

Ён засмяяўся звонкім, радасным смехам, як чалавек, не абцяжараны ніякімі турботамі, у тым ліку і пакутамі сумлення. Яна прысела побач, ужо не баючыся, крыху ўзрушаная гэтай сустрэчай, як бываеш узрушаны сном, у якім убачыў фрагменты з дзяцінства.

— Не, ну ты падумай! — не сунімаўся ён. — У мяне з раніцы было нейкае прадчуванне... Спачатку хацеў падысці ў кінатэатр, дамаляваць афішу, потым перадумаў. Выйшаў падыхаць свежым паветрам, і ногі самі прынеслі сюды... Сядзі так, не варушыся... У цябе такі профіль! Я абавязкова намалюю твой партрэт, вось толькі разбяруся з афішамі... Памятаеш, як я маляваў цябе ў дзяцінстве? Ха-ха... Усе сшыткі на гэта перавадзіў. А ты выхоплівала свае партрэты і рвала іх на дробныя кавалкі, каб ніхто не ўбачыў. А я ўсё роўна маляваў... І тады, калі мы сядзелі на гэтых бярвёнах...

Яна павяла плячамі і вінавата ўсміхнулася:

— Не трэба, Толя, прашу цябе, лепш не трэба...

— Ну што ты, я ж не папракаю!.. Калі б не гэта... здарэнне, я так ніколі і не даведаўся б, што падабаюся... падабаўся табе. Тады ўсе навокал мітусіліся, выцягваючы мяне з-пад гэтых бярвёнаў, твая бабуля пабегла выклікаць «хуткую дапамогу», ты плакала... А я быў такі шчаслівы!.. Урач, які накладваў мне швы, спытаў, чаму я ўвесь час усміхаюся, няўжо мне не баліць? А я сапраўды не адчуваў ніякага болю, дакладней, гэты боль здаваўся драбязой у параўнанні з тым, што ты мне тады сказала...

Ён перастаў гаварыць і пацёр шчаку — у тым месцы, дзе быў шрам. Цяпер яна выразна бачыла гэты рубец — ад скроні і амаль да падбародка. Пакінула пра сябе памяць, нічога не скажаш. Што на яе тады найшло? Сядзелі ціха-мірна на гэтых бярвёнах, пакуль не падышла суседская дзяўчына, дваццаціпяцігадовая Стася, і не прысела побач. На ёй быў кароценькі хатні халацік і... больш нічога. Стася закінула нагу за нагу — так, што агаліліся сцёгны. «А мне партрэт зробіш, мастак? — спытала ў Толіка з выклікам. — Ці ты малюеш толькі тых, з кім...» Яна брудна вылаялася і зарагатала. Ён нічога не адказаў — пачырваneў і апусціў галаву... Таня магла б дараваць яму што заўгодна, толькі не гэта здрадніцкае маўчанне. Яна нахілілася да яго блізка-блізка і сказала так ціха, каб чуў толькі ён: «Ведаеш, я цябе вельмі кахаю. Але яшчэ больш... ненавіджу!». І з усёй сілы штурханула яго ў бок Стасі: «Ідзі, малюй сваю прыгажуню!». Толік не ўтрымаўся на нагах і паляцеў, Стася адскочыла, бярвёны, нічым не замацаваныя, скрануліся з месца і «паехалі» ўніз...

— Колькі нам тады было? Пятнаццаць? — спытала яна.

— Шаснаццаць. І чатыры месяцы. Мы ж нарадзіліся амаль у адзін дзень... А на наступны год ты ўжо не прыехала да бабулі — паступала ў інстытут, а я ўсё роўна кожны вечар залазіў на гарышча і глядзеў на вашы вокны, доўга глядзеў, думаў — а раптам убачу цябе.

— Ну... Я ж прыехала пазней...

— Праз год, калі я ўжо служыў у войску. Сястра пісала, што бачыла цябе, што ты стала такая... такая... іншая. І што прыязджала не адна... Ты выйшла за яго замуж?

— Схадзіла ненадоўга.

— ??? Не сышліся характарамі?

— Нешта накшталт. А ты? Рана ажаніўся?

— Не рана і не позна. Як усе. Яна працавала касіркай у кінатэатры, я там маляваў. Мілае дзяўчо, вельмі мяне кахала...

— Ну што ж, віншую, выдатны выбар.

— Выдатны... Толькі мне ніколі, ні разу не хацелася яе маляваць. Нават не спрабаваў.

Памаўчалі.

— Я, напэўна, пайду, — сказала яна. — Аўтобус ад'язджае ў чатыры гадзіны, а ў мяне яшчэ шмат спраў. Ды і ты ідзі дадому, цябе, напэўна, чакаюць. Не трэба так з імі, яны ў чым вінаватыя?

Ён не паспеў адказаць. Ля ўваходу ў сквер з'явіліся постаці дзвюх жанчын — старэйшай і маладзейшай. Заўважыўшы іх, ён занервавaўся, палез у кішэню па цыгарэты... Хацеў закурыць, але рукі моцна дрыжэлі, і запалкі тухлі.

— Вось ты дзе! — сказала старэйшая. — Мы паўгорада аблётралі, усіх тваіх прыяцеляў абышлі, а ты тут на сонейку грэешся. Ды яшчэ і не адзін — кралю сабе знайшоў!.. А ты сказаў сваёй кралі, што дома цябе двое дзяцей чакаюць і што ў тваім халадзільніку мыш з галадухі павесілася, а цябе з працы паперлі? Калі б не я...

— Не трэба, мама, — спыніла яе маладзейшая. — Знайшоўся — і дзякуй Богу. Пайшлі, Толік, дадому, я там варэнікаў наляпіла, тваіх любімых. Ты ж, напэўна, два дні нічога не еў...

— Бывайце, Анатоль Іванавіч, — Таццяна прамовіла гэта выразна і без усялякіх эмоцый. Узяла яго руку ў сваю і моцна патрэсла, як звычайна рабіла гэта падчас дзелавых сустрэч. — Прыемна было пабачыцца праз столькі гадоў.

Яна пайшла ўжо да выхаду, але раптам, быццам нешта ўспомніўшы, развярнулася і шпарка пакрочыла назад.

— Я тут падумала, Анатоль Іванавіч... Дарэмна вы да гэтага часу не намалявалі жончын партрэт. У вас цудоўная жонка і вам сапраўды пашанцавала.

...Ідучы па алеі, яна паглядзела на гадзіннік і ўздыхнула. Гэта магло азначаць толькі адно: рандзеву з юнацтвам скончылася. Дома чакалі стосы дакументаў і папер і абсалютна пусты халадзільнік. «Трэба зрабіць варэнікаў! — падумала нечакана для сябе. — З творагом, а яшчэ лепш, з вішнямі».

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

г. ВИТЕБСК **20.09.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НА АУКЦИОНЕ С ПРИМЕНЕНИЕМ В ХОДЕ ТОРГОВ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Минимальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка за участие в торгах, рублей
1.	Здание магазина, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок площадью 0,0625 га, сроком аренды 50 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади – 0,0026 га.	**111493170**	**32643288**	**8824570**
2.	Здание фельдшерско-акушерского пункта, расположенное по адресу: Витебская обл. Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 53, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) - одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки общей площадью 105,4 кв.м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 50 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га.	**64998342**	**23093493**	

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в г. Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Продавец: Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», телефон в Витебске: (0212) 378887.

Условия пользования земельными участками: заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителями аукционов в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию объектов в срок, не превышающий два года.

Аукцион состоится 20 сентября 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество». Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают заверенную банком копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона, а также:

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

юридическое

Тусоўка

У МІНСКУ ШУКАЮЦЬ ПРЫГАЖУНЬ

Тэлеканал СТБ распачынае кастынгі праекта «Міс Мінск-2011»

Неўзабаве тэлеканал СТБ сумесна з Нацыянальнай школай прыгажосці і Мінгарвыканкамам распачне кастынгі ў пошуку сталічных прыгажунь для конкурсу «Міс Мінск». «Звязда» вырашыла паглядзець, як змянілася жыццё папярэдніх канкурсантак пасля іхняга ўдзелу ў «Міс Мінск-2009».

Тытул значэння не мае

Яна СУПРАНОВІЧ. На момант удзелу ў «Міс Мінск-2009» — студэнтка Інстытута сучасных ведаў. Хоць у самім конкурсе дзяўчына не заняла прызавога месца, менавіта яе ў тым жа годзе дэлегавалі на конкурс «Міс Інтэрнэшнл-2009», дзе беларуска заняла 5-е месца.

Дар'я САЛАДУХА. У 2009 годзе вучылася ў Краснадарскім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў, на конкурсе «Міс Мінск» атрымала тытул другой віцэ-міс. Тады Дар'я марыла адкрыць буцік для балерын і вучняў харэаграфічных класаў. Мара дзяўчыны пакуль не спраўдзілася, аднак спраўдзілася іншае — Дар'ю ўзялі ў трупу артыстаў Тэатра оперы і балета Беларусі. У 2010 годзе балерына прадстаўляла Беларусь у конкурсе «Міс Інтэрнэшнл-2010».

Лейла ІСМАІЛАВА. Менавіта ёй у 2009-м прысудзілі тытул «Міс прэса». Свой тытул мадэль апраўдала: пасля вучобы ў грэчаскім універсітэце імя Арыстоцеля дзяўчына прайшла жорсткі кастынг на

вядучую «Дзіцячага Еўрабачання-2010». Пасля — праца на тэлебачанні і ў рэкламе. У 2011-м Лейла атрымала чырвоны дыплом выпускніцы журфака БДУ.

Марына НЯКРАСАВА. Два гады таму самай абаяльнай яе прызналі гледачы. У якасці прыза «Міс глядацкіх сімпатый» атрымала паездку ў Францыю. Прыгажосць і голас дзяўчыны не пакінулі абыякавымі прадзюсараў гурту «Лас Вегас», салісткай якога і стала ў выніку Марына. Сёння дзяўчына — салістка дзявочага трыа і выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Крысціна КУЧЫНСКАЯ. У конкурсе сталічных прыгажунь яна атрымала званне «Міс Фота». Запомнілася ўсім прысутным месяцовай паходкай Джэксана. Тады Крысціне было 26 гадоў, і яна была самая ўзроставая з канкурсантак. У тым жа годзе дзяўчына ўвайшла ў ТОП-50 самых прыгожых і паспяховых людзей Мінска. Сёння дзяўчына вядомая як свецкая львіца, «зорка» начных клубаў і... спявачка. І хоць у рэпертуары пакуль толькі адна песня, не выключана, што ў будучым мадэль зробіць кар'еру, як калісьці Анжаліка Агурбаш.

Каму шанцуе, той і ў лапцях танцуе

Мадэльнае жыццё тых, хто прызавых месцаў на конкурсе не ўзяў, таксама склалася нядрэнна. **Кацярына КАВАЛЁНАК** пасля конкурсу заключыла дамову з Нацыянальнай школай прыгажосці і працягвае працаваць мадэллю. **Таццяна СЕМЯЖОН** і ўвогуле з прадаўца ГЦ «Сталіца» (паралельна дзяўчына вучылася ў БДЭУ) атрымала працу сакратара Нацыянальнай школы прыгажосці. А студэнтка-медык **Ларыса КУЗЬМЯНКОВА** заявіла пра сябе праз год пасля ўдзелу ў «Міс Мінск». У 2010 годзе яна перамагла на конкурсе «Міс фітнэс Беларусі».

А як жа паўплываў тытул пераможцы «Міс Мінск-2009» на **Марыю КУБРАКОВУ**, якая два гады таму была прызнаная самай прыгожай дзяўчынай сталіцы? Пасля перамогі Марыя працягнула вучобу ў Інстытуце культуры і мастацтваў, у тым жа годзе ёй даручылі кіраваць навагоднім парадам Дзедаў Марозаў і Снягурак, дзе Маша была галоўнай Снягуркай сталіцы. Пазней Маша спрабавала свае сілы на кастынгах вядучых «Дзіцячага Еўрабачання» і нават салісткі ў гурт «Топлес».

Рост ад 170 см

Конкурс «Міс Мінск-2009» у нейкай ступені быў эксперыментальным. Патрабаванні да канкурсантак былі больш мяккімі, чым раней. У прыватнасці, у кастынгах маглі ўдзельнічаць мадэлі з ростам ад 165 см. Сёлета такіх патуранняў не будзе. Тое ж — і з узростам.

Як паведамілі арганізатары, крытэрыі да дзяўчат, якія збіраюцца на кастынг «Міс Мінск-2011», сёлета наступныя: узрост ад 18 да 25, рост ад 170 см, дзяўчына не павінна быць у шлюбе і мець дзяцей, дадаткова будзе праверана мінская рэгістрацыя прыгажунь.

Між іншым, якраз «плывучасць» крытэрыяў адбору адкрыла грамадскасці два гады таму Лейлу Ісмаілаву (рост Лейлы крыху не дацягвае да 170 см) і Крысціну Кучынскую (на момант удзелу ў конкурсе дзяўчына ўжо мела 26 гадоў). Чым здзівяць новыя канкурсанткі, стане вядома зусім хутка — першы кастынг пройдзе ўжо 15 жніўня.

Ілья ЛАПАТО.

ШТО БРАЦЬ І КУДЫ ІСЦІ?

Для ўдзелу ў кастынгу «Міс Мінск» трэба мець пашпарт і яго копію, купальнік, туфлі на высокім абцасе і гумку для валасоў. Кастынгі пройдуць 15, 16, 17 і 18 жніўня па адрасе: Мінск, вуліца Мельнікайтэ, 4. Пачатак кастынгаў у 16.00.

ГАНЦАВІЧЫ: НАПЯРЭДАДНІ

НАВАТ непрацяглая фотавандроўка па галоўнай вуліцы дае магчымасць уявіць маштаб самай неверагоднай будоўлі за ўсю гісторыю райцэнтра і заўважыць відавочную трансфармацыю вобліку горада. Ён сапраўды маладзее. А як ужо прыгажэе!.. Крыху меней за месяц застаецца да дня, калі Ганцавічы будуць гасцінна вітаць лепшых майстроў нашага прыгожага пісьменства. І пра гэта нагадвае расцяжка на адным з балконаў пяціпавярховага дома на галоўнай плошчы. Свята ўжо сапраўды адчуваецца.

На фотаздымках: старшыня Ганцавіцкага райвыканкама на адной з навабудоўляў райцэнтра; хутка мяняецца фасад мясцовага гатэля; электрыкі ствараюць эстэтыку на вышыні.

Фотарэпартаж Анатоля КЛЕШЧУКА са сталіцы правядзення Дня Беларускага пісьменства-2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Местоположение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения	Условие проведение аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер
1.	Бобруйский район, д. Калинино, пер. Степной, 3	3 868 800	386 880	**1 890 058** (расходы возмещает победитель аукциона)	Наличие не менее двух участников	Площадь 0,1500 га	№ 720884003601000184

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится **19.09.2011 года** в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. М. Горького, 41, 2-й подъезд, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений – **13.09.2011** года до 17.00. Информация о земельных участках по контактным телефонам в г. Бобруйске: 52 70 24, 52 05 34.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10 % от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома № 3604712110312 в АСБ «Беларусбанк», филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

Местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона принимает решение о передаче в частную собственность гражданину Республики Беларусь (победителю аукциона) земельного участка. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения победитель аукциона обязан внести плату за выкупленный в частную собственность земельный участок, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Банкаўская картка: ЦІ ЎСІМ ЗРУЧНА?

УПЫТАННІ перахода на карыстанне банкаўскімі карткамі Віцебшчына адстае толькі ад Мінска. Але пакуль параўнальна мала людзей разлічваецца «электроннымі грашыма» за тавары і паслугі.

Як паведаміла «Звяздзе» **Лілія ІВАНОВА, начальнік галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці,** удзельная вага безнаяўных разлікаў у рознічным тавараваротце вобласці — 9,6 працэнта (паводле звестак за першае паўгоддзе). Для параўнання: у сярэднім па краіне — 9,1 працэнта.

Што тычыцца аб'ёму платных паслуг, то безнаяўныя плацяжы на Віцебшчыне (паводле звестак за першыя тры месяцы гэтага года) — 12,5 працэнта, а ў сярэднім па Беларусі 11,1 працэнта.

Мяне як радавога ўладальніка банкаўскай карткі цікавіць: ці хапае банкаматаў, інфармацыйных кіёскаў, тэрміналаў? На Віцебшчыне зараз налічваецца больш за 360 банкаматаў і звыш 580 інфакіёскаў. Колькасць банкаўскіх картак у насельніцтва — каля 1,2 мільёна штук.

Што тычыцца так званага тэрмінальнага абсталявання, пры дапамозе якога ажыццяўляюцца безнаяўныя разлікі, яго ў крамах, паштовых аддзяленнях і гэтак далей у прынцыпе дастаткова — 5,5 тысячы, акрамя таго, каля 1,2 тысячы — у банкаўскіх пунктах абслугоўвання. Цікавы паказчык: кожная другая аперацыя, якую ажыццяўляюць уладальнікі картак — менавіта безнаяўны разлік.

Як высветлілася, прадстаўнікі банкаў выступаюць і ў ВНУ, і ў працоўных калектывах, арганізацыях: адпаведнае даручэнне ў свой час было дадзена на ўзроўні кіраўніцтва аблвыканкама.

А ці вучыць хто-небудзь уладальнікаў картак імі карыстацца? У прыватнасці, як з банкамата здымаць грошы? Так, на сабе праверана ў адным з банкаў. Падыходзіш да супрацоўніцы, калі яна, вядома, стаіць ля ўвахода ў залу абслугоўвання, яна і дапаможа атрымаць наяўныя.

А калі навічку хочацца атрымаць грошы самастойна? І гэта тычыцца, напэўна, у першую чаргу пенсіянераў, якія вельмі асцярожна карыстаюцца высокімі тэхналогіямі. Пытанне застаецца адкрытым.

Наўрад ці пенсіянеры самі пажадаюць рызыкнуць і заплаціць за кватэру праз інфакіёск? Аказваецца, каб навучыць большую колькасць людзей аплачваць тыя ж камунальныя паслугі пры дапамозе картак, у некаторых банкаўскіх установах «навучаннем» наведнікаў займаюцца спецыяльныя кансультанты. І гэта часта можна ўбачыць, асабліва ў перыяд масавых камунальных плацяжоў.

А ці актыўныя крамы ў прадастаўленні зніжак тым, хто разлічваецца за тавары карткамі? У адной краме зніжка — працэнт, ды і тое калі купіш тавараў на суму агульным коштам ад 100 тысяч рублёў. Некаторыя гандлёвыя цэнтры могуць даць і трохпрацэнтную зніжку, але пры ўмове, калі будуць куплены тавары на вельмі вялікую суму. Напрыклад, ад двух мільёнаў рублёў. Прываблівае такая зніжка? Не вельмі.

Затое ў цэнтры Віцебска, ведаю, ёсць крама, у якой, незалежна ад сумы таго, што купіў, калі расплачваешся карткай, даецца зніжка — 1 працэнт. У выніку тут пакупнікоў значна больш. Што ж датычыцца арганізацый, якія аказваюць паслугі, не памятаю, каб нехта прапаноўваў зніжкі пры разліках безнаяўнымі грашыма. А шкада.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Факт

КРЫЎДЗІШ ПРЫРОДУ? КАРАЮЦЬ РУБЛЁМ

На Віцебшчыне па патрабаванні супрацоўнікаў Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сёлета ліквідавалі больш за 560 несанкцыянаваных звалак, прывялі ў парадак 190 зон каля водных крыніц. Таксама актыўна праводзілі работы па ачыстцы тэрыторый ад баршчэўніку на агульнай плошчы звыш тысячы гектараў. За розныя парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства на вінаватых былі накладзены штрафы на суму звыш 222 мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікі камітэта адзначаюць, што сёлета ў першым паўгоддзі не выкананы адпаведныя заданні дзяржаўнай праграмы па нарыхтоўцы макулатуры, бою шкла, непатрэбных шын, пластмас. Існуе праблема збору адпрацаваных батарэек. У прыватнасці, як высветлілася, у Пастаўскім, Сенненскім, Ушацкім і Шумілінскім раёнах спецыяльныя кантэйнеры для збору батарэек фактычна не выкарыстоўваюцца.

Лепш наладжана праца па ўтылізацыі пестыцыдаў. Напрыклад, у Верхнядзвінскім раёне пры падтрымцы Глабальнага экалагічнага фонду на створаным падземным сховішчы пестыцыдаў завяршаецца этап перапакоўкі непрыгодных рэчываў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЖАНЧЫНА ПАМЕРЛА, ХЛОПЧЫК АТРЫМАЎ ТРАЎМЫ

Такія сумныя вынікі двух дарожна-транспартных здарэнняў, якія адбыліся 10 жніўня ў Быхаўскім раёне і горадзе Бабруйску. У абедзвюх аварыях пацярпелі замежныя грамадзяне.

Як паведамілі ў Магілёўскай ДАІ, а 3-й гадзіне ўначы паблізу вёскі Вараніно Быхаўскага раёна 32-гадовы кіроўца «Форда Мандэа» не выбраў бяспечную хуткасць і страціў кантроль над аўтамабілем, які вылецеў у кювет і перакуліўся. У «Фордзе», акрамя кіроўцы, ехалі чатыры маладыя жанчыны, усе — жыхары Санкт-Пецярбурга. Яны былі дастаўлены ў раённую бальніцу. Праз некалькі гадзін адна з жанчын, якой было 29 гадоў, памерла.

У той жа дзень у Бабруйску каля 17 гадзін на вуліцы Станцыйнай 38-гадовы кіроўца на аўтамабілі «Нісан» наехаў на хлопчыка 2006 года нараджэння, жыхара Растоўскай вобласці Расіі. Малы пераходзіў дарогу ў неналежным месцы. У выніку ён апынуўся ў бальніцы з чэрапна-мазгавой траўмай і страсеннем мозга.

Ілона ІВАНОВА.

А КАЗЛЯЦІНЫ НЕ ПАСПЫТАЎ

Каля пас. Жамчужны (Баранавіцкі раён) інвалід першай групы па зроку трымаў казу навязанай на полі. Гэты момант выкарыстаў 59-гадовы жыхар в. Лебяжаны і забіў казу. Але пагрузіць яе на веласіпед не паспеў. Мясцовы жыхар, які стаў сведкай злачынства, выклікаў міліцыю, і забойцу казы затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КАЛІ ТАВАР НІЧЫЙ

А пятай гадзіне раніцы брэсцкія памежнікі каля в. Хабовічы (Кобрынскі раён) затрымалі «Аўдзі-200», у якой знаходзіліся трыкатажныя вырабы і абутак. Кіроўца растлумачыў, што тавар яму не належыць. На тавар коштам 159 млн рублёў дакументаў не было, і яго канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НЕКАЛЬКІ ШТРЫХОЎ ДА НАВЫКАЎ ЖЫЦЦЯ ПА СРОДКАХ, або Куды знікаюць грошы...

Адна мая сяброўка на днях скардзілася, што ніяк не можа прызвычаіцца да новых коштаў у крамах. З-за гэтага ўжо каторы месяц яна бярэ пазыку, каб неяк выжыць. Але калі я даведалася пра памер яе зарплаты, то зразумела, што праблема нават не ў цэнах, а хутчэй, у навыку жыць па сродках. Каб неяк дапамагчы такім людзям, я вырашыла ўзяць пару ўрокаў вядзення хатняй гаспадаркі ў маці трох дзяўчынак.

У іх сям'і пяць чалавек, але на самую маленькую дзяўчынку маці яшчэ атрымлівае дапамогу на дзяцей да трох гадоў. Таму мы вырашылі разлічваць на сям'ю з чатырох чалавек. Сярэднямесячны даход іх сям'і яшчэ ў лістападзе быў вышэйшы за сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек. Сёння ўжо ніжэйшы. Гэта звязана з тым, што кошты за студзень—чэрвень выраслі, і ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны павялічылі памер мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек на 28,8%, і сёння ён складае 675 980 рублёў на аднаго чалавека.

— Я спачатку вельмі спалохалася новых цэн у краме і зажурылася, — расказвае Яўгенія Ворс, маці траіх дзяцей. — Але неўзабаве ўзяла сябе ў рукі, бо ад майго настрою залежыць настрой маіх дачушак. Наогул усё пазнаецца ў параўнанні...

Мая бабуля ў дзяцінстве перажыла вайну. Яна са сваімі роднымі жыла ў лесе. Затым таксама было шмат выпрабаванняў. Галоўнае, лічыць, нічога не баяцца, верыць у лепшае — яно абавязкова будзе! Зараз ёй 80 гадоў, яна вельмі актыўная бабулечка. У яе ёсць дача, дзе яна вырошчвае гародніну і лічыць, што як толькі яна кіне працаваць на зямлі і пачне сядзець на лавачцы каля пад'езда то, магчыма, памрэ. А так у яе няма часу хварэць і тым больш паміраць. І мне здаецца, гэтая ўстаноўка правільная — трэба любіць жыццё і жыць, а не плакаць ад таго, што некаторы час замест ёгурту давядзецца піць кефір.

Яўгенія расказала, што яе сям'я вырашыла эканоміць на забавах. Напрыклад, раней яны любілі хадзіць у парк катацца на атракцыёнах, а цяпер такія паходы сям'і часова не па кішэні.

— Затое мы можам пайсці на пікнік у звычайны лес ці ў заапарк, дзе можна менш патраціць грошай, — дзеліцца ідэяй Яўгенія. — Бяром з сабой смачную ежу, якую самі прыгатавалі, і нават дазваляем сабе купіць недарагія чыпсы. І для дзяцей гэта ўсё роўна сапраўдная падзея, мае дзеці знойдуць чым заняцца і без атракцыёнаў.

Таксама маці траіх дзяцей не лічыць вялікай стратай і тое, што яны наогул перасталі заходзіць у «Макдональдс», не купляюць тарты, дарагія цукеркі, зефір у шакаладзе і іншыя прысмакі, якія вельмі любяць дзеці. Затое дзяўчынкі могуць часцей ласавацца мамінай выпечкай.

Яшчэ ў апошні час шматдзетная сям'я замяніла экзатычныя фрукты і ягады на дачныя парэчкі і агрэст. Там жа, на дачы, частуюцца сваёй агароднінай (кабачкамі і капустай) і зелянінай. Дзеці замест ёгурцаў і салодкіх тварожкоў сталі больш піць малака і кефіру.

— Зараз мы не тратім грошай на вэнджаныя каўбасы і іншыя падобныя мясныя прысмакі,— дадае шматдзетная маці. — Аднак як і раней мы ядзім мяса амаль тры разы на тыдзень. Рыба на нашым стале бывае зараз вельмі рэдка, і тое толькі таму, што мы яе не любім. Напрыклад, сёння раніцай мы елі аўсяную кашу, на абед — суп, на падвячорак — кукурузныя шматкі, а вось вячэраць будзем разам з нашым татам, «па-сапраўднаму» — катлетамі, бульбай і салатай!

Самая малодшая з дзяўчынак у сям'ю прыносіць хоць і не вельмі вялікі, але даход — дапамога на дзяцей да трох гадоў. Але гэта не адзінае дасягненне малюткі: дзяўчынцы прыйшлося навучыцца хадзіць на гаршчок, хоць раней яна і глядзець на яго не хацела. Гэта дазволіла сям'і эканоміць на памперсах, якія займалі даволі значную частку сямейнага бюджэту.

Муж Яўгеніі зарабляе амаль два з паловай мільёны: 400 тысяч патрэбна, каб пагасіць крэдыт на аўтамабіль, і амаль столькі ж грошай ідзе на аплату камунальных паслуг і тэлефонаў — гарадскога і мабільных. Каля двухсот тысяч беларускіх рублёў траціцца на пральныя парашкі, адбельвальнік, мыла, шампуні і іншыя прадметы гігіены. На праезд у транспарце — яшчэ каля 100 тысяч...

Паводле звестак Мінпрацы і сацыяльнай абароны, асноўныя артыкулы расходаў сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек у цэнах сёлетняга чэрвеня наступныя: прадукты харчавання — 58,9%, адзенне, бялізна, абутак — 15,7%, карыстанне жылым памяшканнем і камунальныя паслугі — 7,1%, бытавыя паслугі, транспарт, сувязь — 5%, прадметы культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння — 8,3 %, культурна-асветныя мерапрыемствы і адпачынак — 1,5%, узносы і плацяжы — 1,5%, прадметы санітарыі, гігіены, лекі — 2%.

— Мне здаецца, у нашай сям'і прыклад на так і размеркаваны даходы, — разважае Яўгенія. — Толькі вось плацяжы, узносы і камунальныя паслугі займаюць у нас значна большую частку у працэнтах, чым у афіцыйных нормах. А 60 % бюджэту ў нас і сапраўды ідзе на прадукты, толькі разам з адзеннем.

Аднак, як прызналася Яўгенія, апошні час іх сям'я ўвогуле не набывала новага адзення для дзяцей. Калі нешта вельмі трэба, шматдзетная маці старэецца набыць адзенне ў «сэканд-хэндзе». Абутак часцей за ўсё набываюць новы. Вядома, бывае, што дзеці ходзяць і ў ношаным абутку, але толькі тады, калі знаёмыя аддаюць яго ў добрым стане.

— На адзенне мужа мы амаль не тратім грошай, — дадае Яўгенія. — У яго вельмі адказная работа, і таму ён заўсёды павінен быць апрануты добра. Усе касцюмы, кашулі, гальштукі, а таксама абутак яму набывае яго маці. Яна вельмі ганарыцца ім, таму клапоціцца, каб ён выглядаў годна. Калі б не дапамога маёй свекрыві, я нават не ведаю, як бы мы выкручваліся.

Свой гардэроб жанчына папаўняе таксама ў сэканд-хэндзе, і то не часта. І нават колькасць абутку Яўгеніі не супадае з колькасцю абутку, які ўваходзіць у склад спажывецкага кошыка сям'і з чатырох чалавек. Так, у наборы адзення, бялізны, абутку для жанчын ва ўзросце ад 30 да 55 гадоў павінны быць боты зімовыя і асенніе на тры гады, туфляў дзве пары на 4 гады, туфляў летніх таксама дзве пары на чатыры гады і адна пара красовак на тры гады. У Яўгеніі ёсць боты і зімовыя, і асенніе, і нават дзве пары асенніх туфляў, толькі вось летніх у яе адна пара, а красовак увогуле няма.

— Мне, як і ўсім людзям, хочацца большага, — смяецца жанчына. — Але ў прынцыпе, мне гэтага абутку хапае.

Хацелася б адзначыць, што сям'я Яўгеніі не з'яўляецца малазабяспечанай.

— Крытэрыем малазабяспечанасці з'яўляецца бюджэт **ПРАЖЫТКОВАГА** мінімуму, — тлумачыць **галоўны спецыяліст упраўлення комплекснага аналізу і кардынацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Людміла СІНЮЦІНА**. — На сёння бюджэт пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва са жніўня складае 442 360 рублёў.

Мінімальны **СПАЖЫВЕЦКІ** бюджэт — гэта нарматыў, які служыць для аналізу ўзроўню і ступені дыферэнцыяцыі даходаў насельніцтва. Напрыклад, калі даход у сям'і на аднаго чалавека ніжэй пражыткавага мінімуму, яна лічыцца малазабяспечанай.

Але калі даход вышэйшы за пражыткавы мінімум, але не вышэйшы за спажывецкі, то такая сям'я лічыцца проста сям'ёй з нізкім даходам. Дзяржава такім сем'ям таксама можа аказваць пэўную падтрымку. Напрыклад, яны могуць атрымаць ільготны крэдыт і субсідыю на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Вядома, як, колькі і на што траціць свае грошы, кожны чалавек вырашае сам. Аднаму і ў галаву не прыходзіць, што, калі не хапае грошай, замест вадкага мыла можна купіць кавалкавае. А хтосьці ўмудраецца і з невялікім прыбыткам адкласці грошай на адпачынак. Усё залежыць ад меры чалавека.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота аўтара.

Да ведама

СКРАЗНОГА РУХУ НЕ БУДЗЕ ДВА ДНІ

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, у сувязі з рамонтам моста на перагоне Аляхновічы — Уша 16 і 18 жніўня скразнога руху прыгарадных электрацягнікоў ад Мінска да Маладзечна (з 6.15 да 21.30) не будзе.

Электрацягнікі, якія адпраўляюцца са станцыі Мінск-Пасажырскі, будуць ісці да станцыі Аляхновічы і назад, дызель-цягнікі з Маладзечна — да станцыі Уша і назад. Перавозка пасажыраў паміж станцыямі Аляхновічы і Уша будзе весціся аўтобусамі па чыгуначных білетах. Прыпынкі на пунктах Баяры і Ласі будуць на трасе ў месцах размяшчэння павільёнаў білетных касаў па патрабаванні пасажыраў.

16 і 18 жніўня электрацягнік, які звычайна адпраўляецца з Маладзечна ў 5.49, будзе адпраўляцца ў 5.21, прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 7.28. Адмяняюцца дызель-цягнікі 15 і 17 жніўня: Ашмяны — Мінск адпраўленнем са станцыі Ашмяны ў 20.51; 16 і 18 жніўня: Гудагай — Мінск адпраўленнем са станцыі Гудагай у 7.45, Маладзечна — Гудагай адпраўленнем з Маладзечна ў 6.15, Мінск — Гудагай адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 6.00, Мінск — Ашмяны адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 17.57.

Прызначаюцца цягнікі: 15 і 17 жніўня — дызель-цягнік Ашмяны — Маладзечна, які адправіцца са станцыі Ашмяны ў 20.51; 16 і 18 жніўня — дызель-цягнікі Маладзечна — Гудагай, якія адправяцца з Маладзечна ў 7.27, Маладзечна — Ашмяны адпраўленнем з Маладзечна ў 19.30, электрацягнік Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 22.00.

Чыгуначнікі звяртаюць увагу пасажыраў на тое, што працягласць паездкі ў названыя дні павялічыцца на гадзіну і больш. Больш падрабязныя даведкі можна атрымаць па тэлефонах: 105, 225 70 00 (паслуга бясплатная).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХТО БУДУЕ МІНСК?

НАЎРАД ці хто будзе аспрэчваць, што сталіца нашай краіны проста ўвачавідкі расцвітае, робіць яркае ўражанне на гасцей горада адметнасцю формаў новых будынкаў, якасцю і стылёвасцю іх аздаблення. А хто ж творца ўсёй гэтай прыгажосці? Ёсць адказ, і вельмі красамоўны!

«Мы будуем сталіцу» — так называецца кніга, выпушчаная нядаўна выдавецтвам «Літаратура і Мастацтва». Кніга багата ілюстраваная. Яна прысвечана калектыву Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінскбуд». У выданні цікава апавядаецца пра гісторыю стварэння і станаўлення будаўнічага комплексу, яго важкі ўклад у аднаўленне галоўнага горада нашай краіны. Значнае месца адведзена дзейнасці трэстаў і ўпраўленняў, перспектывам іх развіцця, лепшым кіраўнікам і спецыялістам.

Чытач даведаецца, што кожнае з падраздзяленняў, якія ўваходзяць у аб'яднанне, па-свойму ўнікальнае, а ўсе разам утвараюць самую буйную ў Беларусі будаўнічую арганізацыю, якая здольная рэалізаваць праект любога ўзроўню складанасці, прытым у рэкордна сцісłыя тэрміны. Прыклады апошніх гадоў — Дом міласэрнасці, тэнісныя корты, крыты футбольны манеж, Палац воднага спорту, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца» і іншыя аб'екты.

Выданне — добры падарунак да Дня будаўніка, і не толькі для саміх будаўнікоў. Мінчане могуць убачыць там любімыя куткі роднага горада, магчыма, нават свае дамы, вуліцы, знакавыя аб'екты, якімі можна пахваліцца перад гасцямі. Несумненна, кніга стане карысным дапаможнікам для патэнцыйных кліентаў мінскіх будаўнікоў. Будуемся — значыць дбаем пра будучыню!

Уладзімір ЗАЛУЖНЫ.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 августа 2011 г. 115-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска

№ предмета аукциона	Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел. 285-56-02			
1.	Ул. Жилуновича, 43, площади на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, санузел, отдельный вход. Под детское кафе с режимом работы до 21.00.	360,45	12 650
2.	Ул. Народная, 26, корп.1, площади на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, отдельный вход. Под непроизводственное использование (офис).	161,7	5 660
3.	Ул. Красина, 27, комн. 61, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение. Под непроизводственное использование (офис), склад.	5,9	207
4.	Ул. Л. Чайкиной, 15, комн. 2б, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами. Под непроизводственное использование (офис).	44,3	1 555
КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска», тел. 252-80-63			
5.	Ул. Брыля, 21, площади на первом этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение, канализация. Под непроизводственное использование (офис).	52,2	1 830
КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294-01-11			
6.	Ул. Солтыса, 141, здание гаражей (площадь 93,6 кв.м) – для хранения и обслуживания автотранспорта, административное здание (площадь 162,5) – под непроизводственное использование (офис).	256,1	9 000
7.	Ул. Долгобродская, 30, площади на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами. Под непроизводственное использование (офис).	46,2	1 620
КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292-74-31			
8.	Пр. Независимости, 44, гараж. Для хранения автотранспорта.	13,2	463
9.	Логойский тракт, 9, корп.1, помещение на первом этаже жилого дома. Под непроизводственное использование (офис).	8,2	287
10.	Ул. Я. Коласа, 45, корп. 3, помещение на первом этаже, имеется отопление, водоснабжение, санузел, отдельный вход. Под непроизводственное использование (офис).	40,8	1 430
КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска», тел. 253-03-26			
11.	Пр. Пушкина, 77, помещение на первом этаже жилого дома (торговый зал 108,5 кв.м). Под магазин продовольственной группы товаров.	247,6	8 700
КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска», тел. 203-79-43, 203-34-66			
12.	Ул. Раковская, 36, две смежные комнаты на первом этаже (одна комната проходная совместно с другим арендатором), санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Под непроизводственное использование (офис), производственное использование, оказание услуг.	37,59	1 320
КУП «Минский городской центр недвижимости», тел. 328-51-00			
13.	Пр. Победителей, 5, комн. 301 на третьем этаже. Под непроизводственное использование (офис).	36,9	1 295
КУП «Минская спадчина», тел. 226-53-04, 226-47-34			
14.	Ул. Революционная, 13, площади на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел, общий вход с другими арендаторами, аренда с момента ввода здания в эксплуатацию. Под непроизводственное использование (офис).	213,39	7 500
15.	Ул. М. Богдановича, 1, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Для размещения руководителей и иных специалистов органов управления.	16,9	592
16.	Ул. М. Богдановича, 11, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, общий вход с другими арендаторами. Под торговый объект непродовольственной, продовольственной группы товаров (чай, кофе в упаковке, сопутствующие товары).	69,32	2 430
УП «Спецкомбинат КБО», тел. 233-74-31			
17.	Минский р-н, кладбище «Северное», крематорий (ритуальный корпус). Под торговлю (торговый автомат по приготовлению горячих и холодных напитков).	1,5	52,5
Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома, тел. 220-51-34, 219-00-78			
18.	Торговый центр «Столица», тер. Подземные переходы, д.13, пом. 2, – подземный общественно-торговый центр, часть помещения № 414 (нижний уровень), целевое назначение – розничная торговля кондитерскими изделиями, бакалейной продукцией, сувенирами, аксессуарами к мобильным телефонам.	89,75	3 150
19.	Торговый центр «Столица», тер. Подземные переходы, д. 13, пом. 2, – подземный общественно-торговый центр, часть помещения № 212.3 (нижний уровень), целевое назначение – розничная торговля одеждой. *	192,04	6 750
КУП «Минскстранс», Автостанция «Юго-Западная», тел. 219-36-59			
20.	Ул. Железнодорожная, 41, помещение на первом этаже, имеется освещение, отопление, энергоснабжение. Под торговый объект непродовольственной группы товаров.	2,7	94,5
КУП «Минскстранс», Автовокзал «Московский», тел. 219-36-59			
21.	Ул. Филимонова, 63, место в зале ожидания на втором этаже, имеется отопление, энергоснабжение. Под торговый объект (непродовольственной группы товаров) с установкой торгового павильона за счет средств арендатора.	7,0	245
ТКДУП «Минский метрополитен», тел. 219-50-58			
22.	Электродепо «Могилевское», Минский р-н, п/о Тростенец, административно-бытовой корпус, первый этаж, вход через проходную, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, водоснабжение. Под стоматологический кабинет.	69,8	2 450
23.	Станция метро «Уручье», подвальное помещение в пешеходном переходе ВБ-2, имеется отопление, отсутствует естественное освещение, водоснабжение. Под торговый объект продовольственной, непродовольственной группы товаров, реализация печатной продукции, цветов, ремонт часов, бытовой техники, сотовых телефонов.	12,5	438
ОАО «МАПИД», тел. 207-23-89, 201-23-95			
24.	Ул. Ольшевского, 30. Площадь для установки универсального прачечного комплекса.	2,0	70
ГУ «Первомайский ФОЦ», тел. 263-46-93, 267-33-90, 266-25-78			
25.	Ул. Героев 120-й дивизии, 15, фойе второго этажа, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, отсутствует водоснабжение, канализация. Под производственное использование, непроизводственное (офис).	40,0	1 400
26.	Ул. Героев 120-й дивизии, 15, ком. 71а, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, отсутствует водоснабжение. Под производственное использование, непроизводственное (офис).	124,8	4 380
27.	Ул. Героев 120-й дивизии, 15, ком. № 45, помещение на втором этаже, имеется отопление, энергоснабжение, отсутствует естественное освещение, водоснабжение, канализация. Под непроизводственное использование (офис), склад, торговый объект непродовольственной группы товаров.	149,7	5 250
28.	Ул. Героев 120-й дивизии, 15, ком. № 127б, помещение на третьем этаже, имеется отопление, энергоснабжение, естественное освещение, отсутствует водоснабжение, канализация. Под непроизводственное использование (офис).	11,4	400
УП «Бытэкс», тел. 200-99-90, 203-79-66, 306-28-41			
29.	Ул. Московская, 20, помещения № 23 и № 23а на четвертом этаже. Под производственное использование, непроизводственное (офис).	74,6	2 620
30.	Ул. Кульман, 5, помещение № 16 на четвертом этаже, отсутствует естественное освещение. Под производственное использование (склад).	37,1	1 300
31.	Ул. Плеханова, 105, помещение № 32 на втором этаже, имеется естественное освещение. Под непроизводственное использование (офис), производственное использование.	16,26	570
32.	Ул. Герасименко, 28, помещение № 11 на первом этаже, имеется естественное освещение. Под непроизводственное использование (офис), производственное использование.	14,58	512
ГУО «Средняя общеобразовательная школа № 218 г. Минска», тел. 272-21-94			
33.	Предмет аукциона исключен из публикации		
УЗ «Минский городской клинический онкологический диспансер», тел. 202-11-36			
34.	Пр. Независимости, 64, площадь не первом этаже четвертого корпуса. Для размещения платежно-справочного терминала.	1,0	35
35.	Пр. Независимости, 64, площади не первом этаже четвертого корпуса и первом этаже третьего корпуса. Для размещения платежно-справочного терминала.	2,0	70
УЗ «11-я городская клиническая больница», тел. 225-87-97			
36.	Ул. Корженевского, 4, площадь в холле первого этажа главного корпуса. Под торговый объект по продаже книгопечатной продукции.	4,0	140
УЗ «10-я городская поликлиника», тел. 341-33-68			
37.	Ул. Сухаревская, 19, площадь на первом этаже, имеется техническое оборудование, санузел, отопление, отдельный вход. Для размещения объекта общественного питания (буфет).	148,2	5 200
УЗ «Городской родильный дом № 2», тел. 252-77-66			
38.	Ул. Бельского, 60, площадь в холле третьего этажа административного корпуса. Для размещения автомата по продаже горячих напитков.	2,0	70
УЗ «6-я городская клиническая больница», тел. 321-12-55			
39.	Ул. Уральская, 5, место на шестом этаже терапевтического корпуса. Под автомат по продаже горячих напитков.	1,0	35
ТКУП «Минский комаровский рынок», тел. 331-84-00			
40.	Ул. В. Хоружей, 8, крытый рынок, антресольный этаж, павильон № 96. Под торговлю продовольственными, непродовольственными товарами.	10,0	350
41.	Ул. В. Хоружей, 8, цокольное помещение № 30ц, комн. № 2. Под непроизводственное использование (офис), склад (хранение продукции).	5,7	200
42.	Ул. В. Хоружей, 8, помещение № 30ц, комн. № 6. Под непроизводственное использование (офис), склад (хранение продукции).	5,7	200
43.	Ул. В. Хоружей, 8, павильон № 21 на первом этаже. Под торговлю продовольственными товарами, общепит.	19,2	675
ЖКК ОАО «Стройтрест № 1», тел. 293-05-21			
44.	Ул. Платонова, 13, помещение № 6а на первом этаже общежития. Для оказания услуг проживающим.	15,08	530
45.	Ул. Пугачевская, 1, к.77, помещение на четвертом этаже. Для оказания услуг проживающим, кроме химчистки и ремонта обуви.	18,8	660
46.	Пр. Машерова, 20, помещение № 207 на втором этаже. Для оказания услуг проживающим, кроме химчистки и ремонта обуви.	18,0	630
47.	Пр. Машерова, 20, помещение № 206 на втором этаже. Для оказания услуг проживающим, кроме химчистки и ремонта обуви.	18,0	630
ЖКК ОАО «Трест № 15 Спецстрой», тел. 294-37-01			
48.	Ул. Козлова, 18, моечное помещение на четвертом этаже. Под размещение прачечного комплекса (стиральная машина).	2,0	70
УП «Минскметрострой» СМУ № 1, тел. 285-32-08			
49.	Ул. Раковская, 34, помещение на третьем этаже, требуется ремонт. Под непроизводственное использование (офис).	11,3	396
КУП «Минскреклама», тел. 290-55-07			
50.	Ул. Захарова, 76, помещение № 106 на первом этаже административно-производственного корпуса, отсутствует отопление, энергоснабжение, имеется естественное освещение, требуется ремонт, стяжка потолков. Под производственное использование, склад.	93,6	3 290
51.	Ул. Захарова, 76, помещение № 81а на втором этаже административно-производственного корпуса. Под производственное использование, склад.	112,78	3 950
УП «Зеленстрой Центрального района г. Минска», тел. 290-74-73			
52.	Парк Победы, зона отдыха водохранилища «Комсомольское озеро», асфальтированная площадка № 21 для размещения объекта, функционирующего в весенне-осенний период. Под установку надувных аттракционов, прокат электромобилей. Победитель аукциона за счет собственных средств обязан: установить объект требуемой архитектурной формы (переносной аттракцион) и обеспечить его функционирование в соответствии с указанным функциональным назначением; обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии (подключение электроэнергии возможно при условии согласования технических условий по прокладке кабеля сечением не менее 6 мм (нагрузкой 15 кВт) с УП «Зеленстрой Центрального района г. Минска»); установить контейнер и заключить договор со спецпредприятием на вывоз мусора; при необходимости установить биотуалет, обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами; по завершении сезона произвести демонтаж объекта. Согласование эскизного проектного предложения по конструкции и внешнему виду осуществляется победителем аукциона в установленном Мингорисполкомом порядке с комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома и отделом архитектуры и градостроительства администрации Центрального района г. Минска. Продолжительность сезона в 2011 г. установлена с 15 апреля по 15 ноября (при благоприятных погодных условиях).	10,0	350
КУП «Зеленстрой Фрунзенского района», тел. 255-20-20			
53.	Парк «Им. 60-летия Октября», р-н ДК «Сукно», ул. Матусевича, д. 20, специфическое сооружение (площадка) с покрытием из каменного отсева, согласно прилагаемой план-схеме. Для размещения аттракциона «Мультяшкин теремок» при условии предоставления арендатором утвержденного проекта на энергоснабжение аттракциона, договора на энергоснабжение с организацией поставщиком электроэнергии.	16,0	560
ГП «Минский стадион «Динамо», тел. 227-65-62			
54.	Ул. Кирова, 8/4-18, места №№ 188, 190, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под производственное использование, склад.	9,0	315
55.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, места №№ 181, 182, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	9,0	315
56.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, места № 187, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	9,2	323
57.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место №№ 165, 166, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	14,9	524
58.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 150, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	10,7	375
59.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 186, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	6,1	214
60.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 155, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	14,2	498
61.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 158, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	7,2	252
62.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 159, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	7,3	255
63.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 187, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	9,2	322
64.	Ул. Кирова, 8/4-18, западная трибуна, место № 160, помещение без естественного освещения, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	7,1	249
65.	Ул. Кирова, 8/4-18, восточная трибуна, место № 201, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	20,1	705
66.	Ул. Кирова, 8/4-18, восточная трибуна, места №№ 11, 12, 13, 14-16, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис), склад.	93,2	3 270
67.	Ул. Кирова, 8/4-18, восточная трибуна, места №№ 29, 30, 32-34, 24, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис), склад.	54,7	1 920
68.	Ул. Кирова, 8/4-18, восточная трибуна, места №№ 25, 35-40, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис), склад.	100,8	3 540
69.	Ул. Кирова, 8/4-18, восточная трибуна, места №№ 19, 20, планируется реконструкция. Под объект общественного питания.	27,8	975
70.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, места №№ 1-3, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	32,7	1 150
71.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, место № 4, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	17,0	595
72.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, место № 5, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	16,9	594
73.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, место № 6, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	8,4	295
74.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, место № 7, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	8,0	280
75.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, место № 8, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	8,6	302
76.	Ул. Кирова, 8/4-18, тир, места № 9 и № 10, планируется реконструкция. Под непроизводственное использование (офис).	16,7	585
УП «Партизанское», тел. 255-13-56, 255-15-01			
77.	Ул. Центральная, 46, склад № 3. Требуется ремонт, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	730,98	12 800
78.	Ул. Центральная, 46, склад № 3. Требуется ремонт, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	569,24	10 000
79.	Ул. Центральная, 46, склад № 3. Требуется ремонт, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	66,4	2 330
80.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	16,8	590
81.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	17,4	610
82.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	18,7	655
83.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	17,4	610
84.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,4	400
85.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,7	410
86.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,4	400
87.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,9	418
88.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	24,1	845
89.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,4	400
90.	Ул. Герасименко, 57, административно-бытовое здание, планируется снос. Под непроизводственное использование (офис).	11,3	396

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Аукцион состоится **25 августа 2011 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются **с 15 по 23 августа 2011 г.** в рабочее время (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Срок договора аренды 5 лет.

***Условия аукциона по предмету аукциона № 19** *(для помещения № 212.3):*

1. установление границ помещений путем размещения торгового оборудования или устройства временных перегородок из ГКЛ высотой 2,4 метра по границам арендуемой площади (при необходимости возможно устройство перфорированных решеток от перегородки до конструкции подвесного потолка);

2. размещение торгового оборудования выполнить согласно расчету путей эвакуации и согласовать с управлением по эксплуатации ТЦ «Столица»;

3. изменение объемно-планировочного решения помещений должно производиться согласно нормативным правовым актам Республики Беларусь с разработкой проектного решения;

4. технические условия на выполнение проектных работ по объемно-планировочному решению, электрооборудованию, инженерным сетям и т.п. выдаются по запросу арендаторов управлением по эксплуатации ТЦ «Столица».

Учет электроэнергии осуществлять по одному из следующих вариантов:

- общий учет электроэнергии производить по существующим приборам учета, а расчет между арендаторами производить по фактически потребляемой (установленной) мощности;

- в помещении установить индивидуальный прибор учета электроэнергии с разработкой проектного решения;

- установка отдельной группы выключателей с разработкой проектного решения (при необходимости осуществления управления освещением раздельно в каждом помещении).

Все вышеперечисленные работы выполняются арендатором за счет собственных средств без дальнейшей компенсации расходов.

Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, в рабочее время обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в настоящем извещении. Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре объекта недвижимости уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам), а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в течение срока, установленного для приема документов для участия в аукционе, подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, пр. Машерова, 80, код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». **Задаток должен быть внесен до 17.30 23.08.2011;**

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (паспорт, страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства (прописки));

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования (копии свидетельства о государственной регистрации и устава, при необходимости копию контракта с руководителем), документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (информационное письмо), документ о назначении руководителя;

иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц **предъявляют документ**, удостоверяющий личность (паспорт).

При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г.Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества на пять лет в срок в соответствии с законодательством.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление с просьбой согласовать сдачу недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящихся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев с тем субъектом хозяйствования, в отношении которого им направлено заявление о согласовании сдачи в аренду недвижимого имущества.

Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.

13 жніўня

Дзве даты

225-ты дзень года.
Міжнародны дзень леўшуноў.
1961 год — 50 гадоў таму па рашэнні ўладаў былой ГДР была зачыненая мяжа паміж Усходнім і Заходнім Берлінам. Пачалося ўзвядзенне берлінскай сцяны, якая на многія гады стала сімвалам падзелу Еўропы на два варагуючыя лагеры (разбурана 9 лістапада 1989 года).

1923 год — нарадзіўся (г. Мінск) Мікалай Кедышка, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Герой Савецкага Саюза (1965). Да вайны працаваў рабочым Мінскага будтрэста. Увосень 1941 года арганізаваў і ўзначаліў моладзевую падпольную групу, якая да красавіка 1943 года вырасла ў буйную арганізацыю «Андруша». Падтрымліваў сувязь з партызанамі. Кіраваў правядзеннем дыверсій на хлебазаводзе «Аўтамат», гарадской электрастанцыі, чыгуначным вузле і іншых. Толькі ў 1943 годзе камсамольска-моладзевая падпольная арганізацыя правяла ў Мінску і яго навакольлях звыш сарака розных дыверсій. Загінуў у 1943 годзе ў баі з гітлераўцамі, якія акружылі явачную кватэру. У Мінску яго імем названа вуліца, на доме, дзе размяшчаўся штаб падпольнай арганізацыі «Андруша», установлена мемарыяльная дошка.

Цытата дня:

«Як правіла, аб чалавеку можна складваць уяўленне па тым, над чым ён смяецца».

Уілсан Мізнер (1776—1933), амерыканскі пісьменнік.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

НЯДЗЕЛЯ, 14 жніўня
Дзень спрыяльны для зараджэння кахання, аднаўлення адносін, прымірэння, прыёму гасцей, уваходзін, святаў і забаў. Неспрыяльны для паездак, асабліва на поўнач.

ПАНЯДЗЕЛАК, 15 жніўня
Дзень спрыяльны для пачатку новай справы, працягу бізнэсу пасля доўгага перапынку, падпісання дамоў, уступлення ў новую пасаду, для творчасці, пачатку навучання.

АЎТОРАК, 16 жніўня
У гэты дзень вы энергетычна слабыя і лепш за ўсё «не высоўвацца», захоўваць асцярожнасць і пазбягаць канфліктаў. Неспрыяльны час для закладкі падмурка, будаўніцтва, для пачатку лячэння, наведвання хворых.

СЕРАДА, 17 жніўня
Дзень спрыяльны для малітвы і рэлігійных рытуалаў. Сёння паспрабуйце не скардзіцца, не выхваляцца, не паводзіць сябе ганарыста.

ЧАЦВЕР, 18 жніўня
Дзень спрыяльны для куплі каштоўнасцяў, грашовых укладанняў. Дзень добры для бізнэсу, сацыяльнай дзейнасці, грамадскіх спраў, завяршэння здзелак, просьбы пра павышэнне па службе або для пачатку новай працы.

ПЯТНІЦА, 19 жніўня
Дзень перашкод. Не варта пачынаць важных спраў. Небяспека гвалту, рабавання, пажару. Неспрыяльна забіваць жывёлу, гатаваць і есці мяса.

СУБОТА, 20 жніўня
Спрыяльны для прапановы рукі і сэрца, атрымання ўзнагароды або адказу, задавальнення просьбаў, атрымання прызнання, дасягнення выніку сваіх намаганняў.

120 ГЕКТАРАЎ... МАРЫХУАНЫ

Улады Мексікі абвясцілі аб выяўленні самай вялікай плантацыі марыхуаны ў гісторыі краіны. Плошча выяўленых пасеваў канопляў склала 120 гектараў.

Важнае адкрыццё вайскоўцы зрабілі пры патруляванні аднаго з пустынных раёнаў штата Ніжняя Каліфорнія. Знаходка была зроблена недалёка ад горада Сан-Квінцін. Памеры поля, акружанага «агароджай» з высокіх кактусаў і накрытага плёнкай (каб яго не ўбачылі зверху), здзівілі нават вопытных паліцэйскіх з упраўлення па барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў — яго плошча склала... 1,2 тысячы квадратных кіламетраў. Гэта найбуйнейшая плантацыя марыхуаны, знойдзеная ў Мексіцы. На думку адмыслоўцаў, з яго планавалі сабраць ураджай коштам у 160 мільёнаў долараў.

Паліцыя і вайскоўцы цяпер высвятляюць імя ўладальніка наркаплантацыі, на якой працавала прыкладна 60 чалавек. Пры з'яўленні вайскоўцаў работнікі кінуліся бегчы. Некалькіх затрымалі на блокпастах, аднак афіцыйныя абвінавачванні ім не прад'яўленыя. Плантацыя наркагандляроў была забяспечана ўласнай інфраструктурай: для «абслуговага персаналу» былі зроблены сучасныя туалетныя кабінкі з фаянсавымі унітазамі.

Знойдзеная плантацыя будзе ліквідаваная. Урад Мексікі заявіў, што знішчэнне гэтай плантацыі марыхуаны стане сур'ёзным ударам па арганізаванай злачыннасці ў краіне. Дарэчы, марыхуана з'яўляецца адной з асноўных крыніц прыбытку для мексіканскай наркамафіі. Толькі ў мінулым месяцы паліцыя затрымала рэкордную партыю наркотыку, прызначаную для перапраўкі ў ЗША: арыштавана было прыкладна 148 тон.

8 МЕТРАЎ МЭРЫЛІН

У ліпені ў Чыкага была ўсталявана васьміметровая скульптура «Мэрылін назаўжды» скульптара Сьюарда Джонсана — своеасаблівае ўшанаванне памяці славутай актрысы Мэрылін Манро. Помнік у цэнтры горада выклікаў вялікі ажыятаж сярод мясцовых жыхароў і турыстаў, хоць спадабаўся далёка не ўсім.



«Вялікая Мэрылін» — а постаць мае вышыню амаль 8 метраў і вагу больш як 15 тон — стаіць на рашотцы чыкагскага метро, каля будынка гарадскога суда. Для скульптуры аўтар абраў, бадай, самую вядомую позу актрысы з эпізоду кінастужкі «Сем дзён жадання» (1955), калі плынь паветра з рашоткі вентыляцыйнай сістэмы нью-ёркскага метро ўзняла спадніцу белай плісіраванай сукенкі галоўнай гераіні. Каб нагадаць пра шарм, што вызначаў самую вядомую бландзінку свету, скульптар «падарыў» статуі адценне скуры Мэрылін Манро, яе ярка-чырвоную памаду, манікюр з педыкюрам і нават бялюткую карункавую бялізну.

Адразу пасля адкрыцця помніка Мічыган-авеню адчула ўзмоцненую турыстычную нагрузку, а сама скульптура стала ў адзін шэраг з галоўнымі адметнымі мясцінамі Чыкага, і цалкам магчыма, што стане найбольш папулярнай з іх. Пакуль жа, мяркуючы па публікацыях у мясцовай прэсе, «Вялікая Мэрылін» будзе красавацца ў Чыкага да вясны наступнага года.

ЖЫВЫЯ БІРУЛЬКІ

Гэта жорстка, але факт: у Кітаі вы можаце набыць маленькую чарапашку або пару рыбак, якія плаваюць у невялікай, герметычнай пасудзіне. Жывыя жывёлы, змешчаныя ў падфарбаваную ваду — гэта не што іншае, як бірулька для ключоў.

Прадаўцы сцвярджаюць, што ў вадзе ёсць «пажыўныя рэчывы», сілкуючыся якімі малюсенькія чарапашкі або рыбкі могуць пражыць цэлых некалькі месяцаў! Нават калі б гэта было праўдай, то адсутнасць кіслароду і цесната ўсё роўна павольна заб'юць іх. На жаль, такі гандаль не забаронены кітайскім заканадаўствам, і гэтыя бірулькі прадаюцца абсалютна легальна.

Яшчэ адзін папулярны ў Паднябеснай здзек з прыроды — манія штучнага афарбоўвання жаб. Таварыствы па абароне жывёл у Кітаі бесперастанку б'юць трывогу, але прадпрымальнікі ў пагоні за прыбыткам ігнаруюць усе забароны і папярэджанні. Натуральная афарбоўка жаб здалася камусьці недастаткова вясёлай, таму невядомы дызайнер вырашыў дадаць некаторую яркасць у задуму прыроды. З дапамогай розных прылад, у тым ліку лазераў, скуру земнаводных насычаюць вялікай колькасцю хімічных рэчываў.

Яркія колеры, калі верыць гарантыі вытворцы, трымаюцца на скуры жаб ад 4 да 5 гадоў. На жаль, толькі нямногія людзі разумеюць, што такія дозы хімічных рэчываў смяротныя для жаб. Эксперты заяўляюць, што ахвярамі моды сталі тысячы трапічных жаб.

СХАДЗІЦЕ НА П'ЕСУ ПАСПАЦЬ

Звычайна сон падчас спектакля — выразнае сведчанне правалу пастаноўкі, але ў выпадку з лонданскім тэатрам Barbican усё наадварот, гэта абазначае, што шоу мела надзвычайны поспех. П'еса «Калыханка» заключаная ўсыпіць гледачоў да таго, як пачнецца заключны акт.

Гасцям рэкамендуецца прыбыць у тэатр а 22-й гадзіне, не забыўшыся прыхапіць з сабой піжамы і зубныя шчоткі, бо ў тэатры яны правядуць усю ноч. Замест крэслаў у глядзельнай зале ўсталяваныя ложкі на адно, два і нават тры спальныя месцы, так што гледачы могуць атрымаць асалоду ад сну ў гордай адзіноце або раздзяліць задавальненне ад паказу шоу з сябрамі ці сваякамі.

Як толькі публіка пераапранаецца ў піжамы і займае загадзя забраніраваныя ложкі, у зале гасне святло, а на сцэне, падсвечанай шэрымі промнямі, пачынаецца нетаропкая дзея. Яна ўключае спевы і гульню акцёраў, якія часцяком чуюць храп замест апладысментаў, паколькі шоу завяршаецца ў гадзіну ночы. Аднак у гэтым выпадку акцёры лічаць, што яны вельмі добра папрацавалі. Раніцай, а палове восьмай, уключаецца святло, і гледачы атрымліваюць класічны брытанскі сняданак, перш чым адправіцца дадому. Аўтар «Калыханкі» Сайман Касан сцвярджае, што ідэя шоу прыйшла ў яго галаву пасля таго, як сам ён засынаў падчас прагляду фільмаў «Уладар пярсцёнкаў» і «Олівер».

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ЧАРНІЦЫ

Здавён у народзе ведалі, што ягады чарніц неабходна ўжываць пры праблемах страўніка і кішэчніка, пры дыябеце, захворваннях пячонкі і іншых органаў крыві, рэўматызме і падагры.

- Чарніцы таксама стабілізуюць зрок.
- Чарніцы — галінкі разам з ягадамі — сушылі на зіму, вешалі ў цёмных месцах. Шматгадовы вопыт народа вучыць, што вельмі карысна ўжываць чарніцы ў спёку, яны дапамагаюць падтрымліваць сілы ў арганізме. З чарніц варылі смачнае духмянае варэнне, кампоты.
- Ягады чарніц захоўваюць свае каштоўныя лекавыя якасці і не губляюць вялікай колькасці вітамінаў, нават калі іх сушыць і варыць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Кардыянка. Готыка. Пюпітр. Севан. Ген. Мыла. Азана. Арда. Маяк. Ліхтар. Ухіл. Ава. Гарт. Нарыс. Прымат. Укол. Ава. Нара. Амаль. Зліткі. Гнеў. Сак. Агрэст. Лагер. Аса. Сагат. Ліда. Сцяжына.

Па вертыкалі: Гераізмічны. Азарэнка. Вецер. Універсітэт. Цокат. Нарты. Орас. Гай. Сагака. Гак. Класік. Артавед. Асад. Юнак. Гаплас. Кокур. Ара. Эмаль. Абагот. Хром. Фланг. Акр. Арда. Мат. Бар. Авангард. Пантагар. Турава.

Зamop'e

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КУЛІНАРНЫ НАТАТНІК

Яблычны пірог

Спатрэбіцца: *форма для выпечкі з высокімі борцікамі, 1,5 кг яблыкаў (вельмі смачна атрымліваецца з белага наліву і антонаўкі), 1 пачак маргарыну, 300 гр. смятаны, 3,5 шклянкі мукі, 0,5 шклянкі цукру, палова чайнай лыжкі соды, гашанай воцатам, трохі солі, лімон і, па жаданні, ванілін, карыца і цукровая пудра.*

Замешваем цеста з растопленага маргарыну, смятаны, соды, солі, ваніліну (па жаданні) і трох шклянак мукі. Цеста павінна атрымацца кансістэнцыі дражджавога, з якога пякуць пірагі. Калі будзе занадта вадкім — дадаць яшчэ мукі. Раздзяліць на дзе часткі — адна большая, другая меншая — і паставіць на паўтары гадзіны ў халадзільнік.

Тым часам яблыкі ачысціць ад скуркі і семак, нарэзаць на квадрацікі з бокам 1—1,5 см і пырскнуць на іх лімонным сокам.

Праз паўтары гадзіны трэба дастаць цеста і раскатаць спачатку большы пласт да таўшчыні 0,5 см. Высцілаем ім папярэдне змазаную алеем форму, захапіўшы і борцікі.

На цеста роўным слоем насыпаем палову шклянкі мукі і шклянку цукру, наверх раскладваем нарэзаныя яблыкі. Аматары могуць пасыпаць яблыкі карыцай. Хто яе не вельмі любіць — гэтага не робіць.

Цяпер дайшла чарга да другой часткі цеста. Яе таксама раскатваем і накрываем ёй наш пірог. Старанна зашчыпваем краі. Бяром востры ножык і асцярожна разразаем верхні пласт цеста на парцыённыя квадраты, не пашкоджваючы борцік, які ўтварыўся пры зашчыпванні краёў.

Ставім у духоўку і выпякаем на сярэднім агні хвілін 30—40. Калі цеста зверху злёгку зарумяніцца — пірог гатовы. Пірог павінен астываць у форме! Халодны пірог наразаем на квадраты па верхнім «трафарэце», перакладваем на блюда і шчыра пасыпаем цукровай пудрай. Атрымліваецца вельмі смачна і прыгожа!

Яблычныя «ружы»

Такія кветкі ўпрыгожаць любы пірог ці торт.

Спатрэбіцца: *вада — 0,5 л., цукар — 7 ст. л., 1 чайная лыжка лімоннага соку, два яблыкі.*

Гатуем сіроп з вады, цукру і лімоннага соку. Варым, пакуль растане цукар. Яблыкі трэба нарэзаць вельмі тонкімі лустачкамі. Калі сіроп гатовы, пакласці ў яго па некалькі лустачак яблыкаў і варыць літаральна 10-15 секунд у кіпячым сіропе, дастаць і пакласці на талерку, каб з іх сцёк сіроп. Калі яблыкі астынуць, пачынаем збіраць нашу ружачку. Згортваем адзін кавалачак яблычка ў сцяблінку. Потым размяшчаем лустачкі яблыкаў вакол сцяблінкі і фарміруем ружу. Вось і ўсё.

-2776-

ПАРАДЫ СТЫЛІСТА

Сумка — незаменная рэч у жаночым гардэробе

Няма важнейшай рэчы ў жаночым гардэробе, чым сумка. Яна не толькі захоўвае ўсе таямніцы сваёй уладальніцы, яна таксама камуфлюе заганы яе фігуры, падкрэслівае стыль і гаворыць пра ўзровень дабрабыту.

Пры выбары сумкі абавязкова трэба ўлічваць формы, прычым як свае ўласныя, так і будучай пакупкі. Суадносіны гэтых двух складнікаў вельмі важныя. Няўдала падабраны асобнік можа сапсаваць усё аблічча, і гучнае імя на этыкетцы не дапаможа. Сумка павінна знаходзіцца ў некаторай супярэчнасці з агульным тыпам фігуры. Такім чынам яна як бы прыводзіць у раўнавагу ўвесь знешні выгляд. Залішняя круглявасць цела згладжваецца структурнымі прамымі лініямі жаночага аксэсуара. Тым, хто мае вуглаватую фігуру, наадварот, варта выбіраць сумкі з мяккімі, закругленымі лініямі. А вось памеры сумкі і яе «носьбіткі» павінны знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці адзін з другім. У руках у буйнагабарытнай дамы дзіўна будзе глядзецца мініяцюрны шэдэўр. У сваю чаргу мініяцюрным паненкам лепш пазбягаць «манументальных» асобнікаў.

Даўжыню ручак трэба выбіраць з улікам той часткі цела, на якой сумка будзе знаходзіцца. Калі трэба падкрэсліць сцёгны і ягадзіцы — значыць, адпаведна рэгулююць даўжыню ручкі. Бюст будзе выглядаць больш пышным, калі размясціць сумку непасрэдна каля грудзей, падпахай. Бяспройгрышны варыянт — сярэдняя даўжыня. Сумка каля таліі візуальна зробіць гэтую частку цела больш стройнай.

Вызначцеся з прызначэннем пакупкі. Дзелавы «радыкюль» лепш набываць у адпаведнасці з фарматам А4, пажадана цвёрдай фактуры (каб не камячыліся паперы) і з натуральнай скуры (пытанне прэстыжу). На свецкім раўце недарэчная аб'ёмная паклажа, а вось сумка-клатч (без ручак) будзе ў самы раз. Для паездак у метро і прагулак з дзіцем не варта набываць шэдэўр «ад куцюр», вышыты стразамі Свароўскі. А вось сталай наведніцы свецкіх тусовак падобная раскоша не перашкодзіць. Недарэчнай будзе яркая, гламурная сумка ў офісе.

Сумак павінна быць як мінімум дзве: на кожны дзень і «на выхад». На самой справе іх звычайна куды больш. Таму што колькасць гэтых аксэсуараў залежыць ад гардэроба, сезоннасці, а таксама ад жыццёвых акалічнасцяў.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

Выводзім бародаўкі

- Мазаць бародаўкі штодня раніцай і ўвечар сокам свежасарванага чыстацелу. Самы гаючы сок ярка-аранжавага колеру — каля кораня.
- Штодня мазаць бародаўкі сокам часнаку.
- Невялікія маладыя бародаўкі можна звесці сокам дзьмухаўца.
- Штодня ўвечар перад сном вельмі асцярожна, каб не трапляла на здаровую скуру, капаць з піпеткі на бародаўку адну кроплю воцатнай кіслаты. Больш адной кроплі не ўжываць. Бародаўкі хутка пачнуць сходзіць.
- Масу з расціснутых сырых ягад рабіны наносіць на бародаўкі на працягу некалькіх дзён.

-2777-

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.43	20.44	15.01
Віцебск —	5.29	20.38	15.09
Магілёў —	5.33	20.35	15.02
Гомель —	5.35	20.26	14.51
Гродна —	5.59	20.59	15.00
Брэст —	6.05	20.54	14.49

Месяц

Поўня ў 21.58.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Васіля, Веніяміна, Еўдакіма, Івана, Мікалая, Сяргея, Юрыя.*
К. *Алены, Дзіяны, Іпаліта, Максіма, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Усміхнемся

Людзі, не стрыжыцеся ў Зверава! Ён потым на гэтыя грошы песні запісвае!

☺

Мужык выходзіць з пакоя сваёй цешчы з кацянём на руках. Зачыняе дзверы і гучна кажа:
— Як ты насмеліўся падрапаць маму?!
І ціха, шэптам:
— Дай я табе лапу пацісну...

☺

Са светлым півам і цёмная будучыня не такая страшная.

☺

Жонка — мужу:
— Ты мяне ўжо больш не кахаеш, Федзя?
— Чаму ты так думаеш?
— Раней, калі ты вяртаўся з камандзіроўкі, ты спачатку заглядваў ва ўсе шафы, а цяпер — толькі ў халадзільнік.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3881. Нумар падпісаны ў 19.30 12 жніўня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12